№ 3(43)/2002

# Беларускія Ведамасьці

ВАРШАВА, красавік-травень 2002 г.

## НЕ ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА — ГАЛОЎНАЕ ДЛЯ БЕЛАРУСАЎ, А НЕЗАЛЕЖНАСЬЦЬ І СВАБОДА, БО НЕ БЫВАЕ „ПРАВОЎ ЧАЛАВЕКА” ПАД АКУПАЦЫЯЙ




***Дэманстрацыя беларусаў у Нью-Ёрку. 4 траўня.***

## НАЦЫЯ — МОВА. АБАРАНЯЙМА І БЕРАЖЭМ.

*Узмацняецца этнацыд, павялічваецца ціск на беларускую культуру, мэтадычна робіцца чорная справа па ліквідацыі беларускай мовы.*

*Шмат якія беларусы не ўсьведамляюць, аднак, велічыні небясьпекі, якую нясе з сабой такая акупацыйная палітыка рэжыму. Становішча прааналізавалі сябры Беларускага Народнага Фронту. Прынятая спэцыяльная заява, зварот да беларускага насельніцтва **„Пра зьнішчэньне рэжымам Лукашэнкі беларускай мовы і пра неабходнасьць яе абароны”.***

*У заяве паведамляецца:*

„Гісторыя эўрапейскага нацыянальнага адраджэньня, якое было арыентаванае на стварэньне вольнай дзяржавы праз нацыянальнае асьветніцтва народа, паўсюдна засьведчыла галоўнае пытаньне і галоўную каштоўнасьць нацыі, за якую найперш змагаліся адраджэнцы ва Ўсходняй і Цэнтральнай Эўропе. Такой каштоўнасьцю была нацыянальная мова. Яе значэньне не падважваецца, яе неабходнасьць і яе існаваньне не дыскутуецца, гэтаксама, як не дыскутуецца само жыцьцё.

Для Беларусі, якая, страціўшы незалежнасьць, амаль 200 гадоў была аб’ектам асіміляцыйнай палітыкі, захаваньне і сцьвярджэньне беларускай мовы ёсьць ня толькі першаснай неабходнасьцю, але і першай умовай

існаваньня нацыі. Прыярытэт беларускай мовы наўпрост зьвязаны зь дзяржаўнай незалежнасьцю і нацыянальнай сьведамасьцю народа.

Без грамадзкага і дзяржаўнага сцьвярджэньня беларускай мовы, без усьведамленьня яе вызначальнай ролі для гістарычнай рэалізацыі беларускай нацыі ўсе спробы захаваць незалежнасьць краіны, наладзіць эканоміку, узвысіць культуру і ўзровень жыцьця асуджаны на правал.

Найлепшым сьведчаньнем гэтаму ёсьць беларуская гісторыя апошніх двухсот гадоў акупацыі і паводзіны палітычных непрыяцеляў беларушчыны.

* * *

Апошнія сем гадоў ідзе комплекснае і пакрокавае вынішчэньне ўсяго беларускага. Беларуская мова — галоўны чыньнік беларускае нацыі. Пакуль існуе мова — існуе нацыя. Беларуская мова змагла пераадолець часы палянізацыі, гвалтоўнай русіфікацыі, бальшавіцкай навалы і шматлікіх войнаў.

Акупацыйныя рэжымы заўсёды імкнуліся разбурыць найперш мову для таго, каб пазбавіць нацыю гістарычнай памяці і пэрспэктывы, згуртаванасьці і волі да супраціву. Ня сталі выключэньнем і дзеяньні лукашэнкаўскага рэжыму, які па ўказаньні з Масквы і зь яе дапамогаю ўсталяваў у Беларусі ўнутраную акупацыю. Не зважаючы на тое, што ніхто ня мае права распараджацца лёсам нацыянальнай мовы, якая належыць усім пакаленьням беларусаў, у траўні 1995 года быў незаконна арганізаваны так званы „рэфэрэндум" па мове. Скарыстаўшы мэтад гвалтоўных маніпуляцыяў, рэжым навязаў беларусам расейскую мову ў якасьці дзяржаўнай. Галоўны ўдар быў нанесены па сістэме адукацыі. На асноўныя ролі тут пастаўлены асобы з выразна акрэсьленай антыбеларускай пазыцыяй, вызначаныя на бязьлітаснае вынішчэньне беларускай мовы і татальную русіфікацыю. На сёньняшні дзень у Беларусі засталіся адзінкі беларускіх садкоў, школаў і клясаў. Беларуская мова амаль цалкам выцесьненая з вышэйшых навучальных установаў. Паўсюдна ўведзена расейская мова і расейскія мэтодыкі ёсьць інструмэнт паняволеньня маладых беларусаў, разбурэньня іх нацыянальнай тоеснасьці, адлучэньня ад найлепшых нацыянальных і сусьветных традыцыяў. Імёны магільшчыкаў беларускай нацыянальнай мовы вядомыя. І ўсе яны будуць адказваць за парушэньне канстытуцыйных правоў беларускага народа.

Беларуская мова як дзяржаўная незаконна ігнаруецца ў адміністрацыях, міністэрствах, ва ўстановах і на прадпрыемствах. Уся сістэма справаводзтва вядзецца не па-беларуску. У структурах улады выракліся беларускай мовы, дэманстратыўна размаўляюць на мове іншай дзяржавы. Грамадзянам паўсюдна адмаўляецца ў выдачы любых дакумантаў на дзяржаўнай беларускай мове. У краіне запанавала чужая, небеларуская інфармацыйная прастора. На радыё і тэлебачаньні да мінімуму скарочаная колькасьць беларускамоўных перадачаў. Усе аналітычныя праграмы выходзяць выключна па-расейску. Пераважная большасьць газэтаў і часопісаў (у тым ліку і незалежных) выдаецца на расейскай мове. Рэкляма вырабляецца не на мове карэннай нацыі. Кнігарні краіны запоўненыя нізкавартаснай літаратурай на расейскай мове.

Зьнішчэньне беларускай мовы і насаджэньне расейскай рэжым цынічна ажыцьцяўляе на грошы з падаткаў беларускіх грамадзянаў. Пры гэтым замоўчваюцца вынікі перапісу насельніцтва Беларусі 1999 года, паводле якога 81,2% жыхароў краіны назвалі сябе беларусамі, а зь іх 85,6% прызналі роднаю моваю толькі беларускую мову.

Прамаскоўскі рэжым стварыў на Беларусі спрыяльныя ўмовы для расейскай інфармацыйнай палітыкі, якая набыла праявы маштабнай інфармацыйнай вайны супраць беларускай нацыі. Расейскія сродкі масавай інфармацыі на эрзац-мове насаджаюць у нашай краіне культ гвалту, крымінальнай сілы, непавагі да асобы. Краіну захліснула навала ідэалягічных гастралёраў пад выглядам „эстрадных, цыркавых і тэатральных калектываў Расеі", якія пашыраюць атмасфэру бездухоўнасьці ў беларускім грамадзтве.

Галоўны аб'ект расейскай інфармацыйнай зброі — беларуская моладзь. Пад узьдзеяньнем гэтай разбуральнай інфармацыйнай навалы маладыя беларусы, адлучаныя ад нацыянальнай мовы і багатых беларускіх традыцыяў, лёгка становяцца ахвярамі наркаманіі і п'янства, што вядзе да росту злачыннасьці, захворваньняў на СНІД, духоўнай і фізычнай дэградацыі. Намэнклятура ж праз фармальныя нарады і сэмінары здатная толькі бездапаможна імітаваць „клопат пра выхаваньне моладзі".

Актыўную русіфікацыю насельніцтва Беларусі праводзіць руская праваслаўная царква, якая традыцыйна прысутнічае ў Беларусі як антынацыянальны фактар.

Дзеля таго, каб пазбавіць Беларусь нацыянальнай эліты, прамаскоўскі рэжым мэтадычна разбурае беларускую навуку (пад выглядам „рэфармаваньня" Нацыянальнай Акадэміі Навук), нацыянальныя творчыя саюзы, цэнтры і ўстановы. Беларускія навукоўцы і творцы даведзеныя да жабрачага стану.

Каб пазбавіць Беларушчыну матэрыяльнага апірышча ў сваёй краіне, рэжым брутальнымі мэтадамі здушыў беларускае прадпрымальніцтва. І сёньня ўжо нішто не замінае Лукашэнку сплочваць свае ўласныя даўгі расейскім алігархам беларускімі прадпрыемствамі — нацыянальным здабыткам пакаленьняў беларусаў. Самі ж беларусы на сваёй зямлі ператвараюцца ў бяспраўных наёмных рабочых.

Апошнімі гадамі актывізаваліся нэгатыўныя міграцыйныя працэсы. Найбольш актыўная частка беларускага грамадзтва змушаная шукаць лепшай долі па-за межамі краіны. А тым часам павялічваецца наплыў у Беларусь „русскоязычного населения" з усёй постсавецкай прасторы. Шкода, нанесеная Беларусі палітыкай татальнай русіфікацыі, можа быць параўнаная толькі з наступствамі Чарнобылю. Прамаскоўскі рэжым антынацыянальнай палітыкай справакаваў дэмаграфічную катастрофу ў краіне: ад 1994 года насельніцтва Беларусі зьменшылася на паўмільёна чалавек, значна скарацілася сярэдняя працягласьць жыцьця беларусаў, нараджальнасьць зьнізілася да ўзроўню ваенных часоў. Мільёны жыхароў краіны існуюць па-за рысай беднасьці.

Усё гэта сьведчыць, што прамаскоўскія палітычныя сілы, якія загарнулі ўладу ўнутры Беларусі, вядуць прадуманую палітыку зьнішчэньня беларускай мовы. Такая палітыка зьяўляецца часткай этнацыду, ёсьць асноўным парушэньнем правоў народу і правоў асобы.

Сітуацыя, якую стварыў на Беларусі рэжым унутранай акупацыі, сьведчыць пра тое, што культурнае існаваньне беларускай нацыі ў небясьпецы.

Мы лічым неабходным зьвярнуцца да ўсёй краіны і да ўсіх беларусаў у сьвеце з заклікам абараніць беларускую мову.

Існуюць агульныя міжнародныя правілы сужыцьця ў грамадзтве, якія абавязковыя для ўсіх людзей Зямлі. Не павінен чыніцца гвалт над чалавекам. Нельга дапускаць дзеяньняў, накіраваных на зьнішчэньне цэлай нацыі. Ніхто нікому ня мае права зачыняць пэрспэктыву разьвіцьця. Ад любой улады неабходна патрабаваць выкананьня гэтых правілаў.

Мы патрабуем ад рэжыму ўлады на Беларусі спыніць этнацыд і зьнішчэньне беларускай мовы.

* * *

У Беларусі беларуская мова (і толькі беларуская мова) мусіць быць дзяржаўнаю моваю. Руская мова, як мова іншай краіны, навязаная ўладным рэжымам, не павінна выконваць функцыі дзяржаўнай мовы ў Беларусі. Мова дзяржаўных установаў мусіць быць беларускай. Неабходна адрадзіць беларускую школу. Вышэйшую адукацыю беларуская моладзь павінна атрымліваць у беларускай мове. Уся дзяржаўная дакумэнтацыя мусіць весьціся па-беларуску (гэтаксама, як раней, яшчэ да часоў расейскай акупацыі).

Сродкі масавай інфармацыі павінны працаваць на дзяржаўнай беларускай мове. Дзеля гэтага павінны быць створаныя заканадаўчыя магчымасьці. Надпісы, шыльды, указальнікі — у беларускай мове.

Напачатку, дзеля вяртаньня справядлівасьці, адраджэньня і

ўмацаваньня дзяржаўнага статусу беларускай мовы, мусяць быць створаныя прыярытэтныя ўмовы для яе разьвіцьця. Беларуская нацыя ёсьць аўтахтоннай на сваёй тэрыторыі. Яна ёсьць натуральнай і спрадвечнай уладальніцай сваёй працы, зямлі і дзяржавы. Толькі тут, на сваёй тэрыторыі і ў сваёй дзяржаве, яна можа гістарычна рэалізоўвацца, разьвіваць сваю культуру і род. У гэтым выяўляецца яе прыроднае права на сваё існаваньне на сваёй зямлі, на ўнівэрсалізацыю сваёй мовы, на сваё багацьце і культуру. Ніхто чужы ня мае права накінуць беларусам сваю чужынскую мову.

Цяпер, калі рэжым ўзмацніў зьнішчэньне беларускай мовы па ўсіх кірунках, усім беларусам трэба ўсімі сіламі абараняць сваю мову.

Кожны беларус павінен імкнуцца гаварыць па-беларуску. Кожны павінен імкнуцца вучыць сваіх дзяцей у беларускіх школах, а там, дзе іх зачынілі ды перарабілі на расейскія, — патрабаваць вяртаньня статусу беларускай школы. Але перш за ўсё неабходна, каб выкладаньне ва ўнівэрсітэтах вялося па-беларуску.

За беларускую мову ў гэтых надзвычай неспрыяльных абставінах трэба змагацца штодзённа. ***У мове закладзена будучыня нашых пакаленьняў***. Рэжым улады на Беларусі, які зьнішчае беларускую мову, парушае тым самым асноўныя і найгалоўнейшыя правы народа і асобы чалавека. Беларусы, баронячы мову, мусяць ня толькі змагацца з унутранай акупацыйнай палітыкай, але і зьвяртацца ў міжнародныя арганізацыі па правах людзей, бо, падкрэсьліваем, ***найважнейшае пытаньне незалежнасьці, свабоды і існаваньня Беларускай нацыі гэта ёсьць існаваньне, разьвіцьцё і аднаўленьне дзяржаўнай ролі Беларускай мовы***.

*Сойм Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне” і Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ* лічыць, што спыніць разбуральныя этна-культурныя тэхналёгіі, якія апрабоўвае на беларускай нацыі Масква, можна толькі праз адхіленьне ад улады антыбеларускага рэжыму Лукашэнкі.

*Сойм* заклікае патрабаваць новых прэзыдэнцкіх выбараў на Беларусі пад міжнародным пратэктаратам.

*Сойм* прапануе прадстаўнікам дыпляматычных місіяў, акрэдытаваных у Беларусі, міжнародным арганізацыям у перапісцы са структурамі ўлады і ў сваіх публічных выступах выкарыстоўваць дзяржаўную беларускую мову.

*Сойм* зьвяртаецца да беларускіх грамадзкіх і міжнародных арганізацыяў пашыраць у сьвеце інфармацыю пра маштабы этна-культурнай катастрофы, якая напаткала Беларусь у выніку імпэрскай агрэсіі Расеі.

Мы прапануем беларускай нацыянальнай эліце і беларускаму грамадзтву супольна выступіць зь ініцыятывай правядзеньня ***Ўсебеларускага Зьезду*** ў абарону дзяржаўнай беларускай мовы і беларускай нацыі.

***(Сойм Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне” і Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ)***

*20 красавіка 2002 г., Менск*

## „ПРИКАЗЫВАЮ...”

Інжэнера-тэхноляга Дзяржынскага (г. зн. Койданаўскага) Экспэрымэнтальна-механічнага завода ***Міхаіла Сантаровіча*** начальства мэтадычна пераследуе за размову і напісаньне дакумантаў па-беларуску. Прыдумваюць розныя мэтады пераследу. У заяве спадара Сантаровіча ў камісію па працоўных спрэчках, напісанай ім яшчэ ў 1998 г., ён піша наступнае: „8 красавіка 1998 года пры атрыманьні разьліковых квіткоў па заработнай плаце я даведаўся, што за люты месяц быў пазбаўлены дадатковай аплаты. Пры высьвятленьні гэтага пытаньня ў кіраўніка аддзелу А.Мішукова мне было заяўлена, што дадатковая аплата зьнятая за напісаньне мною пашпарта на беларускай мове”.

Але найлепш высьвятляе палітыку рэжыму ў Койданаве наступны дакумант:

***„Министерство Архитектуры и строительства Республики Беларусь. Дзержинский Экспериментально-механический завод. Приказ от 24 июня 1997г. №155-пр.***

***В целях единого ведения документации, общения с заказчиками, взаимопонимания всех сотрудников и покупателей***

***Приказываю: 1. Всю нормативно-техническую документацию на заводе вести на русском языке. Директор завода* Л.П.Быковский**.”*

Як усё зьмяняецца, не зьмяняючыся. Некалі гэтакі, як Быкоўскі, казаў бы пра „манчыза” ды „падзіспаць”, а цяпер „приказывает”.

***Адам МІКША***

* Міністэрства Архітэктуры і будаўніцтва Рэспублікі Беларусь. Дзяржынскі Экспэрымэнтальна-механічны завод. Загад ад 24 чэрвеня 1997 г. №155-пр. Дзеля адзінага вядзеньня дакумэнтацыі, размоваў з заказчыкам, узаемаразуменьня ўсіх супрацоўнікаў і пакупнікоў загадваю: 1. Усю нарматыўна-тэхнічную дакумэнтацыю на заводзе весьці на рускай мове. Дырэктар завода Л.П.Быкоўскі (*з рус.*).

## САШКАЎ СТРАХ

Расейскі хлопчык Саша Фёдараў (пяць з паловай гадоў) жыве ў Менску па вул. Касманаўтаў у доме 33. Марыць паехаць ўлетку да мора. Гуляе ў вайну, „страляе” ў чачэнцаў.

— У людзей жа нельга страляць, — кажу яму я па-расейску.

— Гэта ж ня людзі, гэта чачэнцы, яны дрэнныя, — адказвае хлопчык.

Каб трохі яго суцішыць і паўшчуваць, кажу гэтак:

— Улетку твая мама, тата і бабуля паедуць да мора, а цябе пакінуць з чужой злоснай нянькай.

Саша сьмяецца і працягвае гучна „страляць”. Тут мяне падтрымлівае Надзея Дзімітраўна, ягоная бабуля, і пагрозьліва дадае:

— А разговаривать с тобой она будет на белорусском языке!* — і гучна зарагатала.

Але ўнук тут жа спалохана сьціх.

Для рускага беларуская мова — самае страшнае ў жыцьці (нават калі гэтаму рускаму пяць з паловай). Можа, праўда, не для ўсіх страшна, але Сашу трымаюць у страху з маленства.

***Ангеліна МАСЮТА***

* А размаўляць з табой яна будзе на беларускай мове. (*з рус.*)

## НАЦЫЯНАЛЬНЫЯ КАШТОЎНАСЬЦІ

### *4. Беларуская тэрыторыя і прырода*

Кожны народ жыве на сваёй зямлі, якая зьяўляецца ягонай тэрыторыяй. Гісторыя сьведчыць, што тэрыторыя была і ёсьць найгалоўнейшым нацыянальным багацьцем, найвялікшым народным дабром.

Кожны народ імкнуўся абараніць сваю жыцьцёвую прастору, а некаторыя — пашырыць яе за кошт іншых. За тэрыторыю ішло змаганьне і бясконцыя войны.

Зьява і паняцьце прасторы ёсьць паважная праблема філясофіі, матэматыкі і фізічных навукаў. Прастора, злучаная з часам (ці дакладней — *„прастора-час”)*, ёсьць аснова быцьця фізічнага сьвету. (Гэта значыць — рухомай рэальнасьці, сьвету, у якім мы жывём.)

Прасторавыя парамэтры формы і руху (існаваньня) мусіць мець любое цела, элемэнт, часьцінка ці стан часьцінкі (хваля) на ўсіх узроўнях фізічнага сьвету. Але ўсьведамленьне, пачуцьцё жыцьцёвай прасторы ўласьцівае толькі істотам жывой прыроды.

Усялякі жывы індывідыюм (асобіна) акрэсьлівае сваю прастору (гэта значыць межы, у якіх існуе, рухаецца). Прытым, чым больш высокая біялягічная і псіхічная арганізацыя жывой істоты, тым больш выразнае акрэсьленьне ёй сваёй прасторы. Найбольш абазначана яна ў чалавека, што выклікала адпаведныя сацыяльныя формы яе працягу (кшталтаваньне жыльля, уласнасьці, недатыкальнасьці асобы і г.д.).

Сацыяльнае асэнсаваньне сваёй індывідуальнай прасторы чалавекам не заўсёды супадае з рэалізацыяй. Яно можа розьніцца, не супадаць з магчымасьцямі, залежыць найперш ад узроўню разьвіцьця і культуры грамадзтва.

Няроўныя таксама біялягічныя інстынкты адчуваньня ўласнай прасторы, зьвязаныя непасрэдна з целам. Спэцыялісты адзначаюць, напрыклад, значную шырыню індывідуальнай (біялягічнай) прасторы ў нашчадкаў англа-саксаў і кельтаў і іншыя (меншыя ці большыя) парамэтры ўспрыняцьця яе ў прадстаўнікоў суседніх зь імі этнічных супольнасьцяў і групаў.

З таго, што мне ўдалося назіраць асабіста, ездзячы па сьвеце, я магу толькі пацьвердзіць агульныя меркаваньні. Людзі ў Амэрыцы, напрыклад (нават у такім тлумным і выключным горадзе, як Нью-Ёрк), на вуліцах, у транспарце, у грамадзкіх, гандлёвых месцах, у чэргах — усюды, практычна, не датыкаюцца адзін да аднаго. Калі ў вузкім месцы, на вуліцы, на эскалатары, у вагоне ці ў краме вас мінаюць, то абавязкова просяць прабачэньня. Гэта азначае, што, маўляў, выбачайце, я небясьпечна мінаю вашу тэрыторыю, але я добра да вас настроены, толькі павінен тут прайсьці.

Калі нехта, напрыклад, у чарзе (дзе стаяць, як правіла, амаль што за мэтр адзін ад аднаго) незнарок даткнуўся да іншага, то іншы недаўменна адварочваецца і глядзіць, у чым справа, чаго ад яго хочуць. Таму сітуацыя, каб нехта не заўважыў, што даткнуўся да іншага і не папрасіў бы прабачэньня, проста выключаецца. Інакш — гэта нядобрая сітуацыя.

За пяць гадоў пэрыядычнага знаходжаньня ў Амэрыцы, іншых, скажам так, „тэрытарыяльных" адносінаў між людзьмі — я не назіраў. Тым часам за гэты пэрыяд я ні разу ня бачыў, каб нехта ў гарадзкім транспарце (мэтро ці аўтобусе) саступіў месца старому, калеку ці жанчыне. Людзі (сталыя і маладыя) проста ня ведаюць, што так трэба рабіць. Іх такому не навучылі.

Гэтыя два прыклады праяўленьня сацыяльнай культуры маюць рознае падложжа: з аднаго боку — абкультураны інстынкт пачуцьця прасторы, з другога — маральны нуль, не прыгнечаны тэрытарыяльны эгаізм асобіны.

Абкультураны інстынкт, разуменьне тэрытарыяльнага права, павага да шырокай індывідуальнай прасторы чалавека спрыяе прыязным дачыненьням паміж людзьмі.

Грамадзтва, дзе ў масе, у натоўпе не датыкаюцца адзін да аднаго, не штурхаюцца, не зьневажаюць, не гавораць грубых словаў, стварае добрыя ўмовы для самапачуцьця асобы. І наадварот: там, дзе адсутнічае пашана да прасторавай аўтаноміі чалавека, адбываецца нарастаньне азлобленасьці і агрэсіі.

Раней, за саветамі, мне рэгулярна прыходзілася назіраць такую карціну. Падыходзіць пусты вясковы аўтобус. Ля дзьвярэй скапліваецца натоўп, чалавек 15-20 і шчыльна ціснуцца, чакаюць, пакуль шофер сходзіць у аўтобусную станцыю, вернецца і адчыніць дзьверы. Зь вяртаньнем шафёра ціск павялічваецца, куча робіцца нібы адзінае цела, і, калі дзьверы адчыняюцца, яно — гэтае сьціснутае чалавекацела з жанчынаў і мужчынаў — не адразу можа нават зайсьці праз праём у пусты аўтобус. Нарэшце прарываюцца першыя, ускокваюць унутр і, штурхаючыся, з шумам разьбягаюцца па салоне.

Калі потым спакойна зайсьці ў аўтобус, то людзі ўжо сядзяць, стаяць і размаўляюць між сабой, як ні ў чым ні бывала. Ніхто не адчувае ні зьбянтэжанасьці, ні прыніжэньня, ні сораму за тое, што толькі што адбывалася перад зачыненымі дзьвярыма.

Тут жа побач, за рэспубліканскай мяжой, у балтыйскіх суседзяў, быў той жа сацыялізм, тыя ж калгасы, такі ж узровень жыцьця, практычна, такі ж узровень бытавой культуры і тыя ж савецкія аўтобусы, „ПАЗы" ды „ЛАЗы", але не стваралася перад імі гэтакае „чалавекацела".

Я прывёў адзінкавы прыклад. Але „чалавекацела" у нас узьнікае ўсюды, часта — зь нечаканай нагоды, без аніякай лягічнай неабходнасьці і абгрунтаваньня. Мы лічылі гэта раней вынікам дэфіцытнага сацыялізму.

Можна дыскутаваць аб бытавой культуры, аб неабкультуранасьці прыродных інстынктаў, і тут — рацыя. Але ў падложжы гэтай неабкультуранасьці — розны маштаб асэнсаваньня ўласнай прасторы, рознае адчуваньне індывідуальнай тэрыторыі.

Напрошваецца лапідарнае пытаньне: ці не карэлюецца маштаб асэнсаваньня ўласнай прасторы індывідыумам з патрэбнасьцю індывідуальнай свабоды? Напрасткі тут нічога не карэлюецца. Гэта відавочна. Хоць і можна выявіць пэўныя сувязі. Мае значэньне, аднак, сама зьява, сам фэнамэн індывідуальнай прасторы, які ў вельмі адметны і сваісты спосаб праяўляецца на калектыўным, грамадзкім узроўні быцьця людзей як народу, калі ягоная тэрыторыя ёсьць неад'емнай часткай народнага існаваньня.

* * *

Паўнавартаснае этнічнае асэнсаваньне сваёй калектыўнай жыцьцёвай прасторы зьявілася ў людзей толькі пасьля пераходу да земляробства і аседлага жыцьця. Людзі, прывязаныя да аднаго месца, сталі глыбей адчуваць патрэбнасьць гэтай знаёмай канкрэтнай прасторы. Яна стала больш пазнавальнай для чалавека, часткай ягонага штодзённага жыцьця. Прырода, зноў жа, канкрэтызаваная ў прасторы, становіцца ня толькі агульным асяроддзем існаваньня, але як бы прыродным домам. Пастаяннае месца, пастаянная прырода і пастаянныя суседзі спрыялі сталым кантактам паміж людзьмі, далейшаму разьвіцьцю паняцьцяў „сваё" і „наша". Людзі адной тэрыторыі, якія ўжо раней адрозьнівалі сябе ад чужых па мове і сваяцтве, асеўшы на зямлі, умацавалі сваё супольнае адзінства, наладзілі пастаянства сувязяў у пастаянных абставінах.

Калі лічыць, што людзі эвалюцыйна разьвіваліся з прыроды, то самаўсьведамленьне сваёй грамадзкай асобнасьці і адрозьненьне ад іншых групаў людзей павінна было мець першасны штуршок якраз ад усьведамленьня сваёй калектыўнай тэрыторыі. Паняцьцевае разьвіцьцё мовы і думаньне паспрыялі *асэнсаваньню* супольнай прасторы як чыньніка лучнасьці людзей. Фігуральна гэта выглядала так: маўляў, тыя, што гавораць інакш і робяць па-іншаму, — жывуць *„там",* а мы — *„тут". Тутэйшасьць* ёсьць форма супольнага ўсьведамленьня.

Пераход да земляробства і аседлага жыцьця быў плённым для ўмацаваньня і паглыбленьня *этнічнай сьведамасьці*. У сфэры пастаяннага, прывязанага да мясцовасьці насельніцтва лепш разьвілася этнічная культура (перадача традыцыяў праз лучнасьць пакаленьняў).

Асэнсаваньне калектыўнай прасторы паспрыяла ўнутранай кансалідацыі ранніх этнасаў. За *агульную* тэрыторыю вялося *сумеснае* змаганьне. Тэрыторыя этнічнага расьсяленьня стала перашаснай супольнай каштоўнасьцю.

У гэты час глыбока асэнсоўваецца прырода як неад'емная частка існаваньня. Экзыстэнцыянальная і псіхалягічная залежнасьць ад прыроды ў этнічных народаў вельмі моцная. Для гэтакіх людзей прыродная прастора ёсьць іхная агульная радзіма. Гэта тое, што іх найбольш злучае, дае першасныя сродкі для выжываньня, забясьпечвае жыцьцёвую рэалізацыю, веру ў свае сілы і псіхалягічны камфорт жыцьця.

* * *

Наступны этап грамадзкай самаацэнкі і самавыяўленьня — *народная сьведамасьць*. Яна замацоўваецца ў грамадзтве тады, калі ўзьнікае дзяржава (дзяржаўная арганізацыя ўлады) і афармляюцца сацыяльна-праўныя дачыненьні зямельнай уласнасьці, зьяўляюцца гарады, пісьмовасьць, фіксуецца пісаная гісторыя.

Тэрытарыяльна-прыродны чыньнік тут, як і раней, адыгрывае асноўную псіхалягічна-ацэначную ролю. Але моўна-культурныя і

сацыяльна-палітычныя аспэкты пачынаюць дамінаваць у грамадзкіх паводзінах і ў грамадзкім выбары.

Гэта асабліва стала добра відаць з разьвіцьцём гарадоў і ростам гарадзкога насельніцтва. Гарады былі месцам канцэнтрацыі больш разьвітай культуры і больш складаных сацыяльна-культурных адносінаў. Тут быў і больш высокі, ідэйна асэнсаваны ўзровень народнай сьведамасьці. Гарадзкое грамадзтва больш аддаленае ад прыроды, яно існуе ў сфэры *створаных ім* дачыненьняў і ў асяроддзі *арганізаванай ім* сацыяльна-архітэктурнай прасторы. Народная сьведамасьць у сфэры лепш арганізаванага асяроддзя і абкультуранай прасторы гарадоў набывае больш абстрагаванае (а значыць больш абагуленае) асэнсаваньне, апэрыруе лягічнымі катэгорыямі, сістэмнымі паняцьцямі. Супольная (народная) сьвядомасьць гаражанаў (мяшчанаў) менш зьвязаная з псіхалягічным асэнсаваньнем прыроднай прасторы і кансалідуецца на рацыянальным абгрунтаваньні свайго калектыўнага (народнага) адзінства. А гэта, як бачым, ёсьць вышэйшы і мацнейшы ўзровень сьведамасьці.

Народная сьведамасьць — гэта тое ж этнічнае, калектыўнае ўсьведамленьне сябе, але дамінуючым і фармуючым фактарам яе (псіхалягічным і рацыянальным) зьяўляецца *культура*.

Сучасная культура разьвівалася найперш праз гарады. Гарады былі (і застаюцца цяпер) маторам культуры. Зразумела, чаму культурна арганізаванае грамадзтва заўсёды імкнулася зблізіць горад зь вёскай, не дапусьціць вялікага разрыву паміж гарадзкім і вясковым існаваньнем. (Пра гэта я пісаў у артыкуле „Урбанізацыя”.)

Такім чынам стварэньне дзяржаўнасьці (дзяржаўнай улады) і ўзьнікненьне гарадоў (рост гарадзкога насельніцтва) у праўна арганізаваным земляробчым грамадзтве паспрыяла афармленьню *народнай сьведамасьці* жыхароў адной мовы, адной культуры і адной тэрыторыі.

* * *

Наступны этап кансалідацыі людзей — *нацыянальная сьведамасьць*. Яе афармленьне зьвязанае з пачаткам працэсу пераходу да індустрыяльнага грамадзтва. Пераход паўсюдна суправаджаўся бурным ростам гарадоў, які быў выкліканы разьвіцьцём машыннай (таварнай) вытворчасьці. У выніку адбылося перараьзмеркаваньне балянсу насельніцтва ў карысьць гарадзкога.

У ХХ-м стагодзьдзі бальшыня насельніцтва індустыяльных краінаў жыве ў гарадах. Асноўным сродкам уласнасьці становяцца грошы, што паспрыяла павелічэньню індывідуальнай свабоды чалавека і мабільнасьці яго ў грамадзтве.

У гэтых умовах (на індустрыяльным узроўні разьвіцьця грамадзтва) нацыянальная сьведамасьць становіцца *формай ідэалёгіі* і грунтуецца, найперш, на *нацыянальнай ідэі*. Гэта значыць на такой ідэі, якая імкнецца да стварэньня *нацыянальнай дзяржавы* і асэнсоўвае нацыянальныя каштоўнасьці грамадзтва (найперш — мову, народ, тэрыторыю, культуру, гісторыю, рэлігію і г.д.) як сродкі яго фэнамэнальнага існаваньня, кансалідацыі і разьвіцьця.

Зразумела, чаму з разьвіцьцём нацыянальнай сьведамасьці пачалі развальвацца імпэрыі, што былі турмой народаў. (Народы, сцьвярджаючы нацыянальныя каштоўнасьці, імкнуліся стварыць самастойныя нацыянальныя дзяржавы.)

Суадносіны гарадзкога і сельскага насельніцтва ў індустрыяльным грамадзтве мелі вялікае значэньне для фармаваньня нацыянальнай сьведамасьці. У традыцыйным эвалюцыйным разьвіцьці нацыі працэс адбываўся напружана, але бесканфліктна. У адраджэнскім разьвіцьці (гэта значыць шляхам змаганьня з імпэрыяй ці за незалежнасьць ад іншай дзяржавы) рашаючай была барацьба за сцьвярджэньне нацыянальнай мовы і за горад (за гарадзкое насельніцтва).

Некаторыя нямецкія інтэлектуалісты ў сярэдзіне XIX стагоддзя (напрыклад, К.Маркс) пісалі пра чэхаў як пра загіблы народ, які канчаткова анямечаны і ўжо ніколі не падымецца. Але ў другой палове XIX стагоддзя рэзка ўзмацнілася чэшскае нацыянальнае Адраджэньне. Таварныя адносіны выклікалі павелічэньне насельніцтва гарадоў, куды перасяліліся чэшскія сяляне, якія ператварыліся там у дробных прадпрымальнікаў, гандляроў, рамесьнікаў, купцоў, рабочых і г.д. Яны-то найперш і падтрымалі чэшскі нацыянальна-культурны і адраджэнскі рух. Гарады пачалі рабіцца ўсё больш чэшскімі па мове і па насельніцтву. Урэшце яны й вырашылі зыход нацыянальнага змаганьня за чэшскую культуру і чэшскую незалежнасьць.

Гэта клясычны шлях нацыянальнага Адраджэньня ў Эўропе. Такой дарогай ішлі і беларусы. Шмат якія беларускія нацыянальныя дзеячы дэкляравалі стаўку выключна на вёску і не давяралі зрусіфікаванаму гораду. Яны лічылі, што сьведамы беларус, вышаўшы з вёскі і атрымаўшы нацыянальную адукацыю, апануе і створыць нанова беларускую гарадзкую культуру. Так яно і пачынала рухацца. Але зьнешне-палітычныя сілы і акупацыі прыпынілі і дэфармавалі гэты рух.

Трэба ўлічыць, што зьява індустрыялізацыі грамадзтва, — гэта не нацыянальны, а *цывілізацыйны* працэс, які выклікаў зрух у нацыянальнай сьведамасьці людзей. Паўтаруся, што галоўны яго цывілізацыйны вынік — утварэньне нацыяў і перабалянсаваньне насельніцтва з сельскага ў гарадзкое.

Большасьць людзей індустрыяльнага грамадзтва (як мы ўжо адзначылі) жыве ў гарадах. Гэтага не назіраецца, напрыклад, у „трэцім сьвеце”. Там большасьць — бедныя і жывуць у вёсцы. Гэтым якраз і характарызуецца „трэці сьвет”. Сацыяльная дэмаграфія тут мае вызначальны культуралягічны сэнс.

Увогуле, трэба мець на ўвазе, што ў працэсе цывілізацыйнага руху некаторыя народы ці этнічныя супольнасьці па тых ці іншых прычынах выпадаюць з агульнага цывілізацыйнага разьвіцьця. Яны альбо зьнікаюць, альбо цяжка існуюць (экзыстуюць).

Тысячу гадоў таму, калі балты і славяне (цяперашнія беларусы) суіснавалі побач, то нашыя продкі стварылі гарады, мелі пісьмовасьць і перадавую рэлігію (Хрысьціянства). Балты нічога гэтага ня мелі і не стварылі. Вынік — яны растварыліся дазваньня ў славянскім моры, не пакінуўшы пасьля сябе нават успамінаў, акрамя, хіба што, гідронімаў ды назоваў, тыпу „Дулебы”, „Яцьвягі” ці „Дзяволтва”.

Этнічная сьведамасьць з апірышчам на тэрыторыю, прыроду, традыцыю і род не змагла супрацьстаяць народнай кансалідацыі, што абапіралася на дзяржаву і культуру (і гарады, як цэнтры культуры), плюс на Хрысьціянства, як дактрынальную цывілізацыйную рэлігію.

Другі прыклад: этнічныя сібірскія народы, якія расейскі імпэрыялізм проста стаптаў, збэсьціў, паламаў, спаіў; абрабаваў і згадзіў іхную зямлю і прыроду, прастору выжываньня. Лёс іхны незайздросны. Цяжка нават сказаць, ці ёсьць у гэтых народаў якая-небудзь пэрспэктыва.

Пэрспэктыва людзей (тэрыторыяў), што былі пад заходняй калянізацыяй, лепшая, але фактам ёсьць тое, што некаторыя зь іх, як і пэўная частка ісламскага сьвету, выпалі з індустрыяльнай цывілізацыі.

Сітуацыя драматычная, бо пакуль што безвыходная. Лёгка пралічыць і даказаць, што трэці сьвет ня можа ў гэтай сітуацыі дагнаць разьвітыя краіны. (Таму ён і „трэці сьвет”, — гэта кляймо.)

З другога боку, павялічваецца нянавісьць, эгалітарызм, эміграцыя. Нарастае канфлікт паміж цывілізацыямі, які вельмі нагадвае дачыненьні паміж Рымам і варварамі. Фактычна, гэта той самы канфлікт, такога ж роду, толькі на іншым узроўні і ў іншых умовах.

* * *

Беларусь добра індустрыялізаваная краіна (працэс разьвіцьця затармазіўся толькі за апошнія сем гадоў). Яе структурная дэмаграфія цалкам адпавядае індустрыяльнаму грамадзтву. Толькі чвэрць насельніцтва жыве ў вёсках, а тры чвэрці — у гарадах. Аднак гэты цывілізацыйны ўзровень не карэлюецца зь невысокай нацыянальнай сьведамасьцю грамадзтва.

Токое становішча мае сваё тлумачэньне і абумоўлена, перш за ўсё, трагічнымі ўмовамі ХХ-га стагоддзя, у якіх апынулася Беларусь. Пасьля

генацыду і вынішчэньня эліты грамадзтва ў 1920-1940-х гадах, краіна апынулася ў калгасна-саўгасным рэжыме. У 1950-х гадах, калі пачалася адміністрацыйная (сацыялістычная) індустрыялізацыя, афіцыйнае і афіцыйна-грамадзкае жыцьцё ў гарадах было зрусіфікаванае ў выніку палітыкі КПСС. Беларускія школы былі ўжо зачыненыя, а беларуская мова — перасьледвалася, не дапускалася ў афіцыйны і грамадзкі ўжытак. Стваралася атмасфэра непрыняцьця беларускай мовы (і яе носьбітаў), паколькі яна, згодна палітыкі КПСС, мусіла „адміраць", бо пры камунізме плянавалася адна мова (падразумевалася, што руская). Пра гэта пісаліся псэўданавуковыя дысертацыі, чыталіся даклады на канфэрэнцыях і лекцыі ў інстытутах, паэты плакаліся ў вершах („Кажуць, мова мая адамрэ..." і г.д.).

Інтэлігентаў, якія цьвёрда баранілі мову і беларушчыну, называлі „нацдэмамі" ды „нацыстамі" (а гэта тады былі небясьпечныя палітярлыкі). Іх перасьледвалі, іншых людзей, што размаўлялі па-беларуску, абзывалі „калхозьнікамі", „дзярэўняй", і ўсё гэтае антыбеларускае варварства адкрыта падтрымлівалася зграяй начальнікаў, савецкіх кіраўнікоў, камуністаў, савецкіх палкоўнікаў ды іхных жонак, кагэбістаў, савецкіх настаўнікаў ды камсамольцаў і г.д.

У пачатку 60-х гадоў вясковым людзям дазволілі атрымліваць пашпарты (раней калгасьнікам пашпарты не выдавалі) і больш свабодна перамяшчацца. Пачыналася адміністрацыйная індустрыялізацыя, будаўніцтва гігантаў вялікай хіміі, меліярацыя ды інтэнсіфікацыя і г.д. З пачаткам 60-х назіраецца масавая міграцыя сельскіх людзей у зрусіфікаваныя гарады. За кароткі час насельніцтва Менска павялічылася ўдвая. Ужо на 1979 год на вёсцы засталося толькі 28 адсоткаў жыхароў, амаль 72 адсоткі жылі ў горадзе. Усё гэта яшчэ больш умацавала нацыянальна-дэмаграфічную карціну ў беларускіх гарадах, якія былі беларускімі па пераважным нацыянальным складзе насельніцтава.

Аднак чэшскага варыянту (як сто гадоў таму) не атрымалася. На вуліцах загучэла „трасянка", і горад зноў моўна зрусіфікаваўся. Больш таго, масавы і раптоўны прыход вясковага насельніцтва ў гарады канчаткова дабіў рэшткі даўняй беларускай гарадзкой культуры. Акурат у гэты час амаль бесперашкодна зьнішчаліся гістарычныя цэнтры беларускіх гарадоў, помнікі архітэктуры, пераймяноўвалі вуліцы і г.д. Для прыбылага вясковага насельніцтва горада гарадзкая гісторыя нічога ня значыла, горад быў для іх чужым асяроддзем і не зьяўляўся родным домам. Яны хутчэй стараліся атрымаць прапіску, размаўляць па-руску (як начальства), стаць у чаргу на кватэру і гадоў праз 15 атрымаць яе. (Жыльлё і разьмеркаваньне жыльля было ў руках дзяржаўнай бюракратыі.) На гэтым жыцьцёвыя мэты гарадзкога вяскоўца, практычна, заканчваліся. Нашыя гарады па сваім сацыяльна-культурным узроўні і характару насельніцтва сталі нагадваць вялікія вёскі (толькі без беларускай мовы).

Справа ў тым, што ў 60-70-х гадах у беларускія гарады перасяліліся не эканамічна вольныя людзі, як некалі ў Чэхіі (каб знайсьці працу, зарабіць грошай, адкрыць бізнэс, пачаць вытворчасьць, гандль і г.д.). У беларускія савецкія гарады ўцёк нядаўна запрыгонены, загнаны, запалоханы калгасьнік з адпаведнай псіхалёгіяй, залежнасьцю, няўпэўненасьцю ў сабе і мінімумам патрабаваньняў. Але нават гэты мінімум ён павінен быў яшчэ заслужыць у адміністрацыйнай сістэмы.

Гэта была заплянаваная міграцыя ў таталітарным савецкім сьвеце пад чужой уладай: без свабоды, без дачыненьняў уласнасьці, без пашаны да беларуса і нацыянальных ідэй.

Дэфармаваная этнічная сьведамасьць ня ў стане супраціўляцца ніякай экспансіі, якая валодае канцэптуальнай культурнай (ці квазікультурнай) ідэалёгіяй і ня ў стане захоўваць сваё асяроддзе ў агрэсіўных чужародных умовах. З сьведамасьцю „тутэйшых" у таталітарных абставінах цяжка стварыць нацыянальную гарадзкую культуру, а з псіхалёгіяй „вясковасьці" і ўсьведамленьнем другаснасьці — нельга яе перайначыць.

Каб дасягнуць мэты, асіміляцыйная палітыка імкнецца, перш за ўсё, сцьвердзіць сваю мову на акупаванай тэрыторыі, зьнішчыць нацыянальныя эліты і асіміляваць гарады. Калі гэта рэалізуецца, то далейшы ход асіміляцыі і разбурэньне нацыянальнай культуры адбываецца ўжо хутка і паўсюдна.

Калі ў гэтых абставінах нацыя трацiць мову і пераходзіць на мову асімілятараў, то яна ўцягваецца тады ў самазьнішчэньне, бо неабходныя цывілізацыйныя працэсы (напрыклад, урбанізацыя, прыватызацыя, інфарматыка, адукацыя, уніфікацыя дзяржаўнай сістэмы, стандарцізацыя і г.д.) пачынаюць дзейнічаць не як нацыянальна кансалідуючыя, а як асіміляцыйныя (нацыянальна разбуральныя) мэханізмы.

* * *

У беларусаў, як і ў іншых народаў (асабліва ў тых, што змагаліся за нацыянальнае адраджэньне), існуюць адначасна розныя ўзроўні сьведамасьці. Але калі ў іншых ранейшыя, ужо гістарычныя, уяўленьні пра сябе выяўляюцца як рэліктавыя зьявы, то ў нас, з прычыны асаблівасьцяў гісторыі, яны даволі пашыраныя. Асобы з этнічнай, і асабліва з „трасянковай" сьведамасьцю (этнічна дэфармаванай), не адмаўляюцца ад прыналежнасьці да беларускай нацыі і да Беларускай краіны, але не разумеюць значэньня і не даражаць нацыянальнымі каштоўнасьцямі і інтарэсамі нацыі: беларускай мовай, помнікамі беларускай гісторыі і культуры, беларускай тэрыторыяй, прыродай і г.д.

Анатоль Казловіч у сваіх філясофска-псіхалягічных разважах пра беларускую прыроду і чалавека ў ёй дакладна заўважыў, што для шмат якіх вясковых беларусаў прырода, прастора, у якой яны жывуць, і ёсьць іхная Бацькаўшчына, іхнае паняцьце пра Радзіму, іхны Дом, апошні прыстанак, куды яны імкнуцца, дзе яны знаходзяць упэўненасьць і душэўны спакой. Але калі чужынцы пачалі крамсаць іхную Радзіму, асушаць ды выпростваць, высякаць ды капаць — яны маўчалі. Яны нават не супраціўляліся. Хоць месца ім на іхнай зямлі ўжо амаль не пакінулі.

На жаль, гэта тыповыя паводзіны ігнараваных людзей з этнічнай сьведамасьцю. Аналягічна паводзяць сябе іншыя людзі і цэлыя народы з тэрытарыяльна-прыроднымі паняцьцямі Бацькаўшчыны ў сутыкненьні з вынішчэньнем іхняга жыцьцёвага асяроддзя (народы Поўначы, Сібіры і г.д.).

*Змагацца за сваю прыродную Бацькаўшчыну, супраць вынішчэньня зямлі пасьлядоўна могуць толькі асобы, аб'яднаныя нацыянальнай ідэяй, а не насельніцтва на ўзроўні рэліктавай (і, тым больш, дэфармаванай) сьведамасьці.*

Гэта агульнае месца. Няправільна было б бачыць на Беларусі нейкае выключэньне ці абвінавачваць вясковых беларусаў у тым, да чаго іх змусіла савецкая ўлада, чужынцы і прыбышы, перад якімі яны былі безабаронныя. І мы гэтага ня робім. Людзі, перажыўшы генацыд і ня злучаныя агульнай нацыянальнай мэтай, баяліся выступаць супраць савецкай „уласьці". Страх захаваўся па сёньняшні дзень.

Але каб перамагчы і нават каб захавацца, трэба супраціўляцца ўсялякаму вынішчэньню.

* * *

Тое, што прастора і прырода мае велізарны псіхалягічны ўплыў на чалавека, —гэта аксіёма. Культурныя людзі стараюцца палепшыць сваю прастору і асяроддзе, дзе існуюць.

Падсумоўваючы вопыт, можна зрабіць заключэньне, што існуе, відавочна, пэўны псіхалягічны парог ва ўспрыняцьці „дрэннай" (іншай) прасторы, перайшоўшы які чалавек не вытрымлівае, трацiць сьведамасьць, адбываецца параліч псіхікі. (Псіхалягічны эфэкт парогавай прасторы скарыстоўвалі, напрыклад, рускія энкавэдзісты-бальшавікі пры катаваньні людзей.)

Псіхапарогавым эфэктам валодае, на мой погляд, касьмічная прастора за межамі зямной гравітацыі, дзе экстрымальныя ўмовы для чалавека канчаюцца і пачынаецца псіхічны хаос (цёмнае царства Гаргоны-Мядузы, як сказалі б старажытныя грэкі).

Некалі, у XVIII-XIX стагоддзях, філёсафы будавалі пазнаваўчыя сістэмы геаграфічнага дэтэрмінізму, дзе дамінуючым фактарам уплыву на характар і паводзіны людзей лічылі якраз прастору, геаграфічнае

асяроддзе, залежнасьць ад геаграфічнай шырыні, клімату, вышыні над узроўнем акіяну і г.д.

Погляды геаграфічнага дэтэрмінізму былі вельмі аднабокімі, каб растлумачыць філясофскія праблемы з свайго гледзішча. Тым ня менш, пэўны сьлед у разуменьні зьяваў яны пакінулі.

Я, праўда, не рызыкнуў бы напрасткі зьвязваць прасторавы характар беларускага краявіду з характарам народу, хоць пэўную адпаведнасьць можна знайсьці на этнічным узроўні.

Прыродны ўплыў быў раней і існуе цяпер. Мы ўвесь час адчуваем яго ў эмацыйным успрыняцьці. Гэта становіцца добра зразумелым, калі ад'едзеш ад Беларусі далей. Тады шмат якімі беларусамі апаноўвае настальгія (мэлянхолія, дэпрэсія) па беларускай прасторы і краявідах. Я шмат разоў назіраў гэта ў беларусаў за мяжой і перажываў сам.

Гэта вельмі цяжкі псіхічны стан, які ў некаторых (як правіла, у тых, хто ня ў стане вярнуцца) доўжыцца гадамі і які я нікому б ня зычыў перажываць. Чалавек адчувае боль душы. Ва ўяўленьні, днём і ноччу, узьнікаюць краявіды Бацькаўшчыны і адчуваньне страчанага замілаваньня. Пачуцьцё страчанасьці любові ў некаторых даходзіць да роспачы, да самазабыцьця, да фетышызацыі прадметаў, гукаў і пахаў Айчыны, да галюцынацыяў у рэальнасьці і да нематываванага адчаю (плачу).

Такое адчуваньне можна параўнаць са станам, як пасьля страты каханай ці са стратай (сьмерцю) самага блізкага чалавека. Толькі душа шчыміць шматкроць мацней і даўжэй.

Калі чалавек мае моцную волю і разумее, што зь ім адбываецца, то можна перамагчы настальгію па роднай прасторы, задушыць у сабе боль, загнаць яго на дно. Але калі не змагацца, то, як кажуць, Бог — бацька. Тады дапамагчы можа толькі час.

Тысячы беларусаў пасьля 2-й Сусьветнай вайны, якія апынуліся за межамі Бацькаўшчыны, і шмат хто цяпер прайшлі праз такое выпрабаваньне.

Але ўсё гэта, як кажуць, цяжкая проза. (Хоць, можа, й ня ўсім ведамая). Мяне захапіла іншае адкрыцьцё, якое выявілася само сабой. Трэба было толькі параўнаць.

Я аб'ехаў усю Беларусь, уздоўж і ўпоперак і па пэрымэтру. У беларускім краявідзе паўсюдна адчуваецца нейкая цёплая таемнасьць, нейкая сьвятасьць, прысутнасьць сьветлага Духа. Беларускі краявід мае нейкую Боскую пячатку, душэўную заспакоенасьць. Вось жа нездарма нарадзілася выслоўе: „На Беларусі Бог жыве".

На Беларусі гэтая Боскасьць была для мяне абсалютна відавочнай, і я меркаваў, што так ёсьць ва ўсёй прыродзе. Усюды на Зямлі, думаў я, павінна бачыцца пячатка Бога.

Але потым, паезьдзіўшы трохі па сьвеце і паўзіраўшыся, я нідзе такога, як на Беларусі, ня ўбачыў і не адчуў.

Можа быць, у гэтакім адчуваньні Боскасьці беларускай прыроды ёсьць блізкая псіхалягічная аснова, як і ў перамене прасторы? Але ўсё гэта, як і раней на Беларусі, фіксуецца мной у спакойным стане духу і дастаткова рацыянальна.

Тут справа не ў суб'ектыўнасьці. *Прырода, як і чалавек, мае сваё аблічча.* Ёсьць людзі з добрымі вачыма, сьветлай усьмешкай і спагадным тварам; мы кажам, з Боскім абліччам. Гэтыя людзі валодаюць канцэнтрацыяй дабра.

Прырода таксама валодае такімі асаблівасьцямі ў выяўленчым сэнсе яе вобразу. І гэта (аснова асаблівасьцяў) якраз паддаецца дакладнаму вывучэньню і дасьледваньню. Распрацаваныя пэўныя сістэмы. Так што тут няма містыкі.

Беларуская прырода — унікальная зьява, зьбег выдатных геалягічных, геаграфічных, кліматычных, марфалягічных, экалягічных, флярыстычных, гідралягічных і дэмаграфічных абставінаў, якія ствараюць сваісты вобраз прасторы і аўру прыроды, у якой прыхільна і добра жывецца сваістаму чалавеку, які здольны гэтае Боскае харастство (падкрэсьліваю: пагрунтаванае на аб'ектыўнай прыроднай аснове) адпаведна ўспрыняць, цаніць, шанаваць і любіць.

Вось тут і ўзгадавалася ўзаемасувязь паміж беларускім чалавекам і беларускай прыродай. Пра іншыя дачыненьні ў сфэрах народнага і нацыянальнага грамадзтва мы ўжо гаварылі вышэй.

* * *

Мушу падкрэсьліць яшчэ раз, што *на нацыянальным узроўні разьвіцьця нацыянальныя каштоўнасьці грамадзтва ацэньваюцца і ўсьведамляюцца ім у значэньні ідэй.*

Клопат, пачатак, ініцыятыва ў пытаньні разьвіцьця сьведамасьці заўсёды зыходзіла і мусіць зыходзіць ад энтузіястаў, ад эліты нацыі. Эліта не павінна чакаць нацыянальнай ініцыятывы зьнізу і абвінавачваць людзей у бяздзейнасьці, бо нацыянальная ініцыятыва заўсёды ішла зьверху (гэта значыць, ад сьведамых людзей — ад ідэйнай эліты).

Ініцыятыва эліты — гэта ня заклікі. Гэта ёсьць асьветніцкая праца і дзейнасьць у нацыянальных інтарэсах ва ўсіх сфэрах грамадзкага жыцьця. Нацыянальная сьведамасьць грунтуецца ўжо ня толькі на жыцьцёвай прасторы (ізноў жа, паўтаруся), ня толькі на займаемай тэрыторыі, ня толькі на прыродзе, але на *нацыянальнай ідэі*, *нацыянальных інтарэсах* і *нацыянальных каштоўнасьцях* (мове, культуры, гісторыі, дзяржаве і г.д.).

Істотна аднак тое, што нацыянальная ідэя можа рэалізавацца (у форме нацыянальнай дзяржавы) толькі на *нацыянальнай тэрыторыі.* Іншых прыкладаў у гісторыі не існуе.

Азначэньне нацыянальнай тэрыторыі мае праграмны сэнс для беларускага Адраджэньня.

*„Наша зямля, наша нацыянальная тэрыторыя ад пачатку існаваньня на ёй людзей ёсьць наша зямля,* — адзначаецца ў дакумантах беларускага Адраджэньня. — *На ёй мы, беларусы, і нашы продкі жылі спрадвеку. На ёй мы стварылі нашу гісторыю, культуру і дзяржаву. Наша зямля ёсьць часткай нас самых, нашага гістарычнага, культурнага і нацыянальнага існаваньня. Нічога няма даражэйшага за нашу Беларускую зямлю. Наша зямля непадзельная, недатыкальная, сьвятая.*

*Аніхто — ніякі чалавек, ніякая група людзей, ніякі дзяржаўны ворган, ніякая краіна, ні Беларуская дзяржава, ні Беларускі народ — ня можа распараджацца лёсам Беларускай зямлі, бо яна належыць ня толькі нам, ня толькі тым, хто жыве цяпер, але й будучым пакаленьням беларусаў, датуль, пакуль будзе наш род у Сусьвеце.*

*Наша зямля ёсьць наш вечны Дом, вечная спадчына, якая сягае за межы часу — непадзельны маярат, асьвечаны найвышэйшым гістарычным правам і найвышэйшым абавязкам, неад'емная каштоўнасьць беларускай нацыі. Нашу Беларускую зямлю трэба любіць, берагчы, шанаваць, абараняць ад страты і спусташэньня, умець змагацца за яе." (Праграма Партыі БНФ, 1999 г.)*

Нацыянальная тэрыторыя адыграла гістарычную ролю ў самапазнаньні і самаўсьведамленьні нас як народа, паспрыяла фармаваньню нашага этнічнага характару, псіхалёгіі і мэнтальнасьці, была і ёсьць нашай жыцьцёвай прасторай, дзе мы можам гістарычна (гэта значыць — і ў будучыні, вечна і бясконца) жыць, разьвівацца і існаваць.

Беларуская тэрыторыя, гэтак жа, як Беларуская мова і Беларускі народ, ёсьць найвялікшай каштоўнасьцю беларускага быцьця на Зямлі.

*8 сьнежня 2001 г.* ***Зянон ПАЗЬНЯК***
*Варшава*

# ЧАРНОБЫЛЬСКІ ШЛЯХ

*26 красавіка 1986 года* адбылася Чарнобыльская катастрофа. Узарвалася атамная электрастанцыя на мяжы Беларусі і Ўкраіны. 70 адсоткаў усіх радыёактыўных рэчываў, якія ўтварыліся ў выніку выбуху і трапілі ў атмасфэру, выпала на тэрыторыі Беларусі і забрудзіла мясцовасьць. 20% беларускай нацыянальнай тэрыторыі стала непрыдатнай да жыцьця. Яшчэ столькі ж стала малапрыдатнай.

Камуністычнае кіраўніцтва СССР напачатку схавала ад беларусаў жахлівыя вынікі катастрофы. Захварэлі тысячы людзей, асабліва дзеці. Потым, калі была раскрытая таямніца атамнага выбуху, вынішчэньне беларусаў працягвалася мэтадам знарочыстай бязьдзейнасьці камуністычных уладаў і дзеяньнямі, неадпаведнымі да сытуацыі.

Расея, якая аб'явіла сябе пераемніцай Савецкага Саюзу, да гэтага часу ня выплаціла Беларусі кампэнсацыю за Чарнобыль у памеры 30 мільярдаў даляраў, вызначаную яшчэ за часы СССР. Прамаскоўскі дыктатарскі рэжым у Беларусі скасаваў дапамогу беларусам, пацярпелым ад атамнай катастрофы, і абмежаваў лячэньне хворых дзяцей. Беларускія землі каля Чарнобыля, зь якіх вывезьлі беларусаў, засяляюць цяпер крымінальнымі элемэнтамі з Расеі. Гэта ёсьць схаваная форма генацыду беларусаў і спляніраваная акупацыя беларускіх земляў.

Мы, беларусы, грамадзяне Амэрыкі і палітычныя ўцекачы зь Беларусі, пратэстуем супраць чарнобыльскага генацыду, якому спрыяе ў Беларусі дыктатарскі антыбеларускі рэжым Лукашэнкі.




***Чарнобыльскі шлях у Пінску***

Мы спадзяемся на разуменьне нашага змаганьня з боку ўсіх людзей добрай волі, заклікаем іх падтрымліваць беларусаў, нашае імкненьне да дэмакратыі, нашае змаганьне за аздараўленьне нашых дзяцей, за ўратаваньне дзяржавы, Бацькаўшчыны і свабоды.

*4 траўня 2002 г.* ***Арганізатары дэманстрацыі ў Нью-Ёрку***

## ГЭТА ЯНЫ:

### *Дзікія людзі*

Салдаты 58-й расейскай арміі, што зьнішчае Чачэнію і дыслакуецца на Паўночным Каўказе (Часткова ў Інгушэціі), разбурылі ў час вучэньняў ***хрысьціянскі храм Габа-Эрды IX стагоддзя*** (!) і крэпасьць XII стагоддзя ў вёсцы *Таргім*. Гэта помнікі гісторыі і архітэктуры сусьветнага значэньня, былі пад аховай дзяржавы яшчэ за часы СССР. Улады Інгушэціі перад гэтым выступілі з хадайніцтвам перад міжнароднымі арганізацыямі, каб уключыць сьвятыню *Габа-Эрды* ў сьпіс сусьветнай спадчыны культуры.

12-га ліпеня мінулага года расейскі шрубалёт абстраляў ракетамі фартыфікацыю ў *Таргіме*, разьбіў стары грабовец і вежу.

Рускія вайскоўцы разбурылі дах сьвятыні *Габа-Эрды*, а ўнутры яе зрабілі сарцір. З разьбітых камянёў царквы яны выклалі перад храмам надпіс: „Если не мы, то кто?"*

***Руслан Аўшаў***, тагачасны прэзыдэнт суседняй з Чачэніяй Інгушэціі, абвінаваціў расейскіх вайскоўцаў у вандалізме і паведаміў, што яны „асабліва варварскім спосабам зьнішчылі, згадзілі і зьняважылі помнікі культуры".

***(Паводле „Gazety Wyborczej")***

---

* Калі ня мы, дык хто? (*з рус.*)

## ХРОНІКА ПАРУШЭНЬНЯЎ ПРАВОЎ БЕЛАРУСАЎ

### *Перасьлед друку*

*(факты; 2001 г., працяг з №2/42)*

*28 жніўня* пракуратура Менска ўзбудзіла крымінальную справу па факце паклёпу на „прэзыдэнта" Рэспублікі Беларусь (арт.367 ч.2 КК Беларусі). Нагодай дзеля ўзбуджэньня крымінальнай справы стала публікацыя ў канфіскаваным нумары газэты „Рабочий" артыкулу „Злодзей павінен сядзець у турме!" аб карупцыі сярод кіраўніцтва краіны. (Гэта адбылося перш, чым газэта выйшла з друкарні, што сьведчыць пра ажыцьцяўленьне цэнзуры.)

*29 жніўня.* Зь белымі плямамі выйшлі ў сьвет 2 спэцвыпускі „*Предпринимательской газеты*". Публікацыю артыкулаў „Пасланьне суайчыньнікам" (№32) і „А ты ўжо даў сваю згоду стаць саўдзельнікам злачынства?" (№33) забараніў да друку выконваючы абавязкі дырэктара друкарні „Мэджык" **У.Глушакоў**.

*4 верасьня ў Салігорску* старшыня гарадзкой выбарчай камісіі не пусьціў на ўчастак пазаштатнага карэспандэнта газэты „*Салідарнасьць*", маўляў, назіраць за выбарамі могуць „толькі штатныя супрацоўнікі рэдакцыі". (Гэта супярэчыць арт.13 Выбарчага кодэксу, які прадстаўляе права прысутнічаць пры правядзеньні выбараў прадстаўнікам рэдакцыі, незалежна ад таго, знаходзяцца яны ў штаце ці не.)

*5 верасьня.* Першы намесьнік старшыні Дзяржкамдруку **У.Глушакоў**, які выконвае абавязкі дырэктара прыватнай друкарні „Мэджык", пад пагрозай забароны друкаваньня, запатрабаваў зьняць матэрыялы з нумароў газэтаў „*Народная Воля*" і „*Беларуская маладзёжная*".

■ Пракуратура Гарадзенскай вобласьці ўзбудзіла крымінальную справу па факту разьмяшчэньня ў газэце „*Пагоня*" матэрыялаў, у якіх „утрымліваецца паклёп" на „прэзыдэнта" Рэспублікі Беларусь. Наклад газэты, аддрукаваны толькі часткова, сканфіскаваны ў друкарні. У гэты ж дзень супрацоўнікі пракуратуры Гарадзенскай вобласьці, пракуратуры Ленінскага раёну Гародні, Ленінскага аддзяленьня РАУС, Дзяржкамітэту па фінансавых расьследаваньнях і АБЭЗ правялі ў рэдакцыі „*Пагоні*" выняцьцё матэрыялаў і абсталяваньня, а таксама фінансавай дакумэнтацыі рэдакцыі.

*7 верасьня* Вышэйшы гаспадарчы суд Рэспублікі Беларусь прыняў да разгляду зыск Пракурора Гарадзенскай вобласьці аб спыненьні дзейнасьці газэты „***Пагоня***" і аб ліквідацыі рэдакцыі газэты „*Пагоня*" „ў інтарэсах дзяржавы ў асобе Дзяржаўнага камітэту Рэспублікі Беларусь па друку".

■ Віцебская абласная друкарня адмовілася друкаваць чарговы нумар мясцовай недзяржаўнай газэты „*Витебские деловые новости*", нягледзячы на тое, што рэдакцыя своечасова здала макет у друкарню і зрабіла перадаплату.

■ У Менску супрацоўнікі міліцыі сканфіскавалі 15000 асобнікаў газэты „*Беларуская маладзёжная*", якія знаходзіліся ў багажніку спыненага аўтамабіля. Міліцыянты катэгарычна адмовіліся складаць акт канфіскацыі газэты.

■ Намесьнік старшыні Гомельскай абласной выбарчай камісіі

**Аляксандар Усаў** адмовіў акрэдытаванаму ў гэтай камісіі журналісту ***Анатолю Гатоўчыцу*** ў прадстаўленьні інфармацыі пра колькасьць выбаршчыкаў у раёнах вобласьці і колькасьць прагаласаваўшых датэрміновa. А. Гатоўчыц, згодна з Выбарчым кодэксам, абскардзіў дзеяньні А.Усава ў пракуратуру, аднак пракуратура накіравала ягоную скаргу ў гэтую ж выбарчую камісію.

*8 верасьня.* Напярэдадні выбараў самая тыражная штодзённая недзяржаўная газэта *„Народная Воля”* выйшла зь белымі плямамі.

*9 верасьня* (у дзень выбараў прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь) дзяржаўны інтэрнэт-правайдэр „Белтелеком” адключыў доступ да сайтаў „by”, на якіх выстаўляліся навіны пра выбары. У выніку сталі недаступнымі для прагляду он-лайнавыя вэрсіі незалежных выданьняў *„Белорусская деловая газета”, „Наша свабода”,”Белорусская газета”.*

Перабоі ў працы ў дзень выбараў зьведалі таксама сайты незалежнага агенцтва навінаў *БелаПАН*, Радыё *Рацыя,* беларускай службы радыё *„Свабода”.* Адміністраваньне доменнай зоны „by” знаходзіцца ў веданьні Дзяржаўнага цэнтру бясьпекі інфармацыі пры Савеце бясьпекі. У гэты ж дзень былі адключаныя тэлефоны рэдакцыяў некаторых рэгіянальных СМІ і мабільныя тэлефоны ў цэнтры Менску.

## ***КАСТРЫЧНІК** (2001 г., працяг)*

*Кастрычнік. Менск. 23 верасьня* сябры *Народнага Фронту і ягонай Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ* ўсталявалі чарговыя крыжы пасьля пачатку новага акту курапацкай драмы; *29, 30 верасьня* і *1 кастрычніка* арганізавалі і правялі ў Курапатах талокі, падчас якіх ўсталявалі некалькі дзясяткаў крыжоў, дабраўпарадкавалі тэрыторыю.

*3 кастрычніка* ля цэнтральнай прахадной Менскага аўтазаводу *Малады Фронт* спрабаваў правесьці пікет супраць продажу МАЗа расейскай прамысловай групе „Сібірскі алюміній”. Калі журналісты спыталі ў рабочых, як яны ставяцца да акцыі маладых, тыя адказалі, што ня вераць у продаж роднага прадпрыемства. Як толькі маладыя разгарнулі плякаты (***„МАЗ — беларускі!”****;* ***„НЕ — звальненьням!”***), іх адразу затрымалі міліцыянты і ахоўнікі прадпрыемства. А рабочым ня верыцца...

*2 кастрычніка Сьветлагорскі філіял Нацыянальнага дзяржаўнага гуманітарнага ліцэю* (НДГЛ) імя Якуба Коласа ўключаны ў склад гарадзкой сярэдняй школы №1. Улады гораду адмовіліся захаваць за ліцэйскімі клясамі будынак.

*4 кастрычніка* суд Цэнтральнага раёну Менска прызнаў **Сяргея Віньнікава** (сына былой старшыні Нацыянальнага банку Беларусі Тамары Віньнікавай) вінаватым у незаконным абароце наркотыкаў і асудзіў яго да двух гадоў папраўчых працаў без пазбаўленьня волі. У шмат якіх нават цывілізаваных краінах за „незаконны абарот наркотыкаў” прадугледжана сьмяротнае пакараньне, таму незалежныя назіральнікі прызнаюць гэткі прысуд па такім абвінавачваньні надзіва мяккім і лічаць, што гэта зьвязана з „маўчаньнем Т.Віньнікавай”, якая так шмат казала, што мае кампрамат супраць А. Лукашэнкі, аднак не скарысталa яго падчас выбарчай кампаніі, бо сын знаходзіўся ў турме...

*4 кастрычніка. Баранавічы.* Суддзя **Ж. Капачэўская** разглядала адміністрацыйныя справы двух удзельнікаў акцыі *„Ланцуг неабыякавых людзей” (17 верасьня 2001 г., Баранавічы).* Аднаго з удзельнікаў акцыі (выкладчыка гісторыі ***Л. Трухановіча***) „здаў” ягоны былы вучань, міліцыянт.

*5 кастрычніка* адбыўся працяг судовага працэсу па справе аб закрыцьці газэты ***„Пагоня”*** ў Вышэйшым гаспадарчым суддзе Беларусі. (Суддзя **Валеры Жандараў**.)

*5 кастрычніка* ў Заводзкім судзе Менска распачаўся працэс па адміністрацыйнай справе лідара *Маладога Фронту* ***Паўла Севярынца*** за арганізацыю пікета супраць продажу Менскага аўтазпавода расейскай кампаніі.

*8 кастрычніка* суддзя Барысаўскага гарадзкога суда **Аляксей Болатаў** вынес папярэджаньні ўдзельнікам жнівеньскага „ланцуга неабыякавых людзей” ***Зьміцеру Вішнеўскаму*** і ***Кацярыне Дзядко***. (За ўдзел у той самай акцыі ***Анатоль Аскерка*** быў пакараны штрафам ў памеры 150 мінімальных заробкаў — каля 750 даляраў ЗША).

*8 кастрычніка. Маладзечна.* У час урачыстага адкрыцьця помніка ***Міхалу Кляофасу Агінскаму*** ля Маладзечанскай музычнай вучэльні ***Эдуард Баланчук*** высока ўзьняў над сабой *Беларускі Бел-Чырвона-Белы Сьцяг* і накіраваўся да помніка, каб уганараваць скульптуру кампазітара. На *сп. Баланчука* накінулася міліцыя і ў прысутнасьці ўсіх беларускіх і замежных гасьцей пацягнула яго ў пастарунак.

У гэты ж дзень над ім наладзілі судзілішча. Суддзя **Лужынскі** прысудзіў штраф *(10 мінімальных заробкаў).*

*10 кастрычніка* праўленьне Беларускай асацыяцыі журналістаў зьвярнулася ў Менскі абласны суд з просьбай дапусьціць прадстаўніка БАЖ на закрыты судовы разгляд справы пра зьнікненьне ***Дзьмітры Завадзкага***, бо грамадзкасьць можа не даведацца праўды пра зьнікненьне журналіста.

*З 11 на 12 кастрычніка* ўначы была абрабаваная „незалежная” маладзечанская *„Рэгіянальная газэта”.* Украдзеныя тры сістэмныя блёкі кампутараў, два маніторы, лічбавая фотакамэра, два прынтэры, факс, тэлефонныя апараты і нават электрычны чайнік. Газэта выдаецца з 1995 года, мае наклад больш за восем тысячаў асобнікаў і распаўсюджваецца ў Менскай і Горадзенскай вобласьцях (на тэрыторыі Маладзечанскага, Вілейскага, Мядзельскага, Валожынскага, Смаргоньскага, Астравецкага і Ашмянскага раёнаў).

Сёлета ад злачынцаў пацярпелі таксама магілёўская газэта „Дефакто”, аршанская „Куцейна”, „Вольнае Глыбокае”, менская „Дзень” (двойчы).

*15 кастрычніка* журналістам недзяржаўных СМІ было адмоўлена ў акрэдытацыі на асьвятленьне візыту А. Лукашэнкі ў Гомельскую вобласьць.

*15-16 кастрычніка* ў судзе Ленінскага раёна Берасьця суддзя А. **Міранюк** прысудзіў незалежнаму назіральніку за выбарамі ***Рыгору Варвашэвічу*** штраф у 7 мінімальных заробкаў (50 даляраў ЗША). Яго абвінавацілі па арт. 166 КаАП („непадпарадкаваньне законным патрабаваньням міліцыі”) і па арт. 167.3 КаАП („парушэньне заканадаўства аб выбарах”).

*16 кастрычніка* суддзя **Аляксандар Шылько** прыняў пастанову арыштаваць на 10 сутак ***Валеры Шчукіна*** за ўдзел у несанкцыянаваным пікеце падчас лукашэнкаўскага „усебеларускага народнага сходу” (які адбыўся сёлета ў ліпені).

*16 кастрычніка* суддзя Заводзкага раёну Менска **Мікалай Балаўнёў** асудзіў ***Паўла Севярынца*** да 10 сутак адміністрацыйнага арышту за арганізацыю пікета ля МАЗа.

*16 кастрычніка* суддзя Гарадзкога суда Баранавічаў **Жана Капачэўская** вынесла пісьмовае папярэджаньне ***Алесю Пікулу*** *(за ўдзел у акцыі „Ланцуг неабыякавых людзей” 17 верасьня 2001 г.).*

*17 кастрычніка.* Сын рабочай трэцяй калійнай капальні Салігорску ***Натальлі Капачовай*** захварэў у турме на сухоты. Ён памёр у лютым 2001 г. ва ўзросьце 23 гадоў. Калісьці ён займаўся штангай і важыў 90 *кг*. Перад сьмерцю — 30 *кг.*

Адбываў пакараньне *Юры Капачоў* ў Воршы, спачатку ў 8-й, потым у 12-й калёніі. У камэры (плошчай два на два мэтры) утрымлівалі шэсьць чалавек, у тым ліку і хворых на сухоты. Вязьням забаранялі перадаваць нават вітаміны, ня кажучы пра медыкамэнты. „У сына была тэмпература 40$^{o}$, а яму не далі нават асьпірын”, — кажа маці памерлага вязьня.

Напярэдадні сьмерці сын пасьпеў расказаць маці пра ўмовы, у якіх ён правёў больш за 4 гады. Яшчэ ёсьць сьведкам сябра Юры, які таксама захварэў у Аршанскай турме на сухоты. („Чатыры дні ён ужо ляжаў, ня мог падняцца: у вачах цёмна”.)

Міліцыянты спрабуюць схаваць ад грамадзкасьці праўду. З 70 тысячаў зьняволеных і арыштаваных у Беларусі, ***некалькі тысячаў хварэюць на сухоты***. Дакладныя зьвесткі ў Камітэце па выкананьні пакараньняў ведаюць, але гэтыя дадзеныя старанна хаваюць. І на працэсе міліцыянты адмовіліся паведаміць гэтую лічбу. Было прызнана толькі, што колькасьць захварэўшых на сухоты ў турмах Беларусі ў 15 разоў большае, чым на волі.

*17 кастрычніка.* У верасьні 2001 г. загадчыца аддзелу адукацыі Сьветлагорскага гарвыканкаму **Г. Філіповіч** выдала загад аб расфармаваньні філіі Беларускага гуманітарнага ліцэя імя Якуба Коласа — першай у горадзе ўстановы адукацыі новага тыпу, якая дзейнічала з 1993 г. Навучэнцы ў вольны ад заняткаў час неаднаразова праводзілі пікеты ў абарону ліцэя перад будынкам Аддзелу адукацыі гарвыканкаму і на Цэнтральнай плошчы гораду (перад будынкам Гарвыканкаму).

Паводле даручэньня Гарвыканкаму, 17 кастрычніка ў міліцыю былі выкліканыя 8 навучэнцаў ліцэю: ***Сяргей Герасімаў***, ***Галіна Кузьміна***, ***Соф'я Зобава*** (з 11-га кляса), ***Яніна Воронік***, ***Ірына Дайнека***, ***Вольга Крук***, ***Уладзіслаў Масьлюкоў***, ***Натальля Шафарэнка*** (з 10-га кляса).

*19 кастрычніка* суд Крупскага раёну Менскай вобласьці разглядаў зыск настаўніка ***Андрэя Аляхновіча*** да Крупскага РАНА па аднаўленьні на працы. Настаўнік быў звольнены з пасады сацыяльнага педагога СШ№1 Крупак за актыўны ўдзел у выбарчай прэзыдэнцкай кампані. (Сп. Аляхновіча фармальна звольні паводле Працоўнага Кодэксу „за ўчынак, несумяшчальны са званьнем настаўніка".) Факт звальненьня сп. Аляхновіча сьведчыць пра існаваньне ў Беларусі перасьледу па палітычных матывах тых, хто ня згодны з палітыкай Лукашэнкі.

У ходзе судовага разьбіральніцтва выявіліся нечаканыя акалічнасьці Загадчык РАНА **Анатоль Зайцаў** (адказчык па зыску сп. Аляхновіча) раптам заявіў, што накіроўваў ліст у КГБ з просьбай „разабрацца з Аляхновічам". (Начальнік нават зачытаў гэты данос і прасіў далучыць да матэр'ялаў справы.)

У якасьці сьведкаў на судзе выступалі бацькі вучняў і калегі сп. Аляхновіча, якія характарызавалі яго як высокага прафэсіянала і выдатнага педагога. Справа прыпыненая да часу, пакуль будуць атрыманьня адказы з пракуратуры і Менскага абласнога суда, куды *Андрэй Аляхновіч* падаваў скаргі аб адмене адміністрацыйнага спагнаньня.

*22 кастрычніка.* Кіраўніцтва *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ* накіравала трэці раз ліст *(першы 7 жніўня, другі 25 верасьня)* у Савет Міністраў з патрабаваньнем адмовіцца ад будаўніцтва аўтастрады праз *Курапаты* і з прапановай праекту *„Народная дарога"* ў абход Мэмарыяла беларускага мартыралёга.

*22 кастрычніка* была ўзноўленая крымінальная справа адносна журналістаў крычаўскай „незалежнай" газэты *„Вольны горад"*. Журналісты даведаліся пра гэта толькі праз два тыдні, калі іх ізноў пачалі выклікаць на допыты.

*23 кастрычніка* ў Гомелі на пл. Леніна былі затрыманыя мясцовыя маладафронтаўцы ***Дзяніс Шакалёў*** і ***Юрась Васілюк***. Іх адвезьлі ў Цэнтральны РАУС, дзе пратрымалі тры гадзіны, ня склаўшы пратаколу (да ад'езду А. Лукашэнкі, які ў гэты дзень быў у Гомелі). Прэвентыўна былі затрыманыя ў гэты дзень і пяцёра рэчыцкіх маладафронтаўцаў, якія стаялі на пл. Леніна і размаўлялі між сабой. На іх таксама не складаліся пратаколы, і праз 3 гадзіны ўсіх адпусьцілі.

*24 кастрычніка. Гомель.* КГБ не вярнуў незаконна сканфіскаваную электронную тэхніку (9 кампутараў і рыштунак, 3 друкаркі, 2 сканэры, ксэракс) грамадзкай арганізацыі „Грамадзянская ініцыятыва". Адбылося гэта наступным чынам. Сьледчы КГБ *Уладзімер Вечыкаў* спыніў прыдуманую крымінальную справу і пастанавіў тэхніку вярнуць. У той жа час дазнаўца КГБ **Яўген Сцепаненка** адмовіўся вярнуць гэтую тэхніку. Гэтак яна і засталася ў Гомельскім КГБ.

*24 кастрычніка* каля спэцпрыёмніка-разьмеркавальніка па вул. Акрэсьціна сябры *Маладога Фронту* правялі пікет у падтрымку старшыні арганізацыі ***Паўла Севярынца***, які з 16 кастрычніка адбывае 10 сутак арышту.

*26 кастрычніка* ў Менску ўвечары былі затрыманыя 13 сяброў *Маладога Фронту.* „Вінаватыя" ўсклалі кветкі і запальвалі сьвечкі каля муроў менскай турмы, адкуль 26 кастрычніка 1941 года нямецкія фашыстоўцы вывелі ў апошні шлях падпольшчыкаў і пакаралі сьмерцю каля прахадной дрожджавага заводу. У мерапрыемстве прынялі ўдзел і актывісты габрэйскіх арганізацыяў, бо адна з закатаваных фашыстамі падпольшчыц ***Маша Брускіна*** была габрэйкай.

На ўдзельнікаў акцыі накінуўся АМОН. Маладых людзей зьбівалі, „ставілі на расьцяжку", зьдзекваліся, потым запіхалі ў міліцэйскія „козьлікі" (лаючыся пры гэтым расейскім матам). Праводзілася карная апэрацыя, вельмі падобная на тыя, што немцы праводзілі 60 гадоў таму.

У РУУСе Маскоўскага раёну Менска на затрыманых былі складзеныя пратаколы аб адміністрацыйным правапарушэньні (як на ўдзельнікаў „несанкцыянаванага шэсьця"). Восем чалавек былі затрыманыя да разгляду справы судом і правялі трое сутак у спэцпрыёмніку-разьмеркавальніку.

З *26 на 27 кастрычніка ўначы ў Воршы* быў зьдзейснены напад на кватэру актывіста мясцовай філіі *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ* ***Юры Конушкі***. Невядомыя разьбілі шыбу ў вакне ягонай кватэры. Паводле спадара *Конушкі,* гэта другое падобнае здарэньне пасьля прэзыдэнцкіх выбараў. Аналягічны інцыдэнт ужо быў 13-га верасьня. Як кажа пацярпелы, міліцыя не выключае магчымасьці помсты за палітычную дзейнасьць.

*29 кастрычніка. Менск.* Суддзя Маскоўскага суда **Д. Антаневіч** прысудзіў намесьніку старшыні *Маладога Фронту* ***Аляксею Чарняеву*** і ***Аляксандру Панцялею*** па трое суткаў адміністрацыйнага арышту за акцыю ўшанаваньня менскіх падпольшчыкаў.. ***Алена Валынец*** атрымала папярэджаньне. ***Паўла Яловіка*** апраўдалі.

*29 кастрычніка*. У судзе Чэрвеньскага раёну (Менская вобл.) адбылося пасяджэньне па зыску выкладчыка **Аляксандра Нікіціна** да Сьмілавіцкага сельскагаспадарчага тэхнікуму аб аднаўленьні на працы. Сп. Нікіцін быў звольнены з працы за актыўны ўдзел у незалежным назіраньні падчас прэзыдэнцкіх выбараў. Ягоны сын ***Віталь Нікіцін*** (які таксама выкладае ў Сьмілавіцкім сельскагаспадарчым тэхнікуме) быў пісьмова папярэджаны адміністрацыяй за ўдзел у „антыдзяржаўнай дзейнасьці".

*30 кастрычніка*. У Горадзенскім раённым судзе ***Тадэвуш Гавін*** і ***Мечыслаў Гіруць*** атрымалі папярэджаньне за актыўны ўдзел у кампаніі па выбарах прэзыдэнта. Суддзя абвінаваціў іх у тым, што 7 верасьня ў мястэчку Сапоцкін Горадзенскага раёну яны правялі незапланаваны сход у школе з бацькамі вучняў. М. Гіруць быў даверанай асобай У. Ганчарыка, а Т. Гавін — сябрам абласнога выбарчага штабу Ў. Ганчарыка.

*Кастрычнік*. Паводле дэмаграфічных прагнозаў ААН і беларускіх спэцыялістаў, да 2050 г. насельніцтва Беларусі можа зьменшыцца на 2 мільёны чалавек. Пачынаючы з 1993 года, у Беларусі назіраецца працэс дэпапуляцыі. Насельніцтва зьменшылася на 300 тысячаў чалавек. Характэрнымі рысамі абвастрэньня дэмаграфічнай сітуацыі зьяўляюцца скарачэньне нараджальнасьці, рост сьмяротнасьці, старэньне насельніцтва, скарачэньне працягласьці жыцьця. Каэфіцыэнт нараджальнасьці зьнізіўся на 34,5% і склаў 9,1 чалавек на тысячу насельніцтва. Узровень сьмяротнасьці узрос на 26%. На 2,7 гады скарацілася працягласьць жыцьця.

■ У апошнія гады ў Беларусі няўхільна пагаршаюцца паказчыкі здароўя дзяцей і маці, рэзка абвастрылася і праблема якаснага і колькаснага ўзнаўленьня насельніцтва. Паводле словаў дацэнта катэдры акушэрства і гінекалёгіі Беларускага мэдычнага ўнівэрсітэту *Людзьмілы Мажэйкі*, апошнім часам сярод падлеткаў назіраецца рост хваробаў, што перадаюцца полавым шляхам. Штогод да 10% абортаў у краіне робіцца ва ўзросьце ад 12 да 17 гадоў. Гэта, безумоўна, уплывае на рэпрадуктыўнае здароўе, сьведчыць пра дэградацыю сям'і і маральнасьці ў краіне.

*Кастрычнік*. Да гэтага году віншавальныя паштоўкі (часам і на беларускай мове) друкаваў Менскі паліграфкамбінат імя Якуба Коласа. А сёлета ў Беларусі прадаецца выключна імпарт — расейскія паштоўкі маскоўскай фірмы „Ортдизайн". Паштоўку на беларускай мове ня знойдзеш цяпер днём з вагнём. Ды і кніжныя паліцы завалены расейскай макулатурай.

*Кастрычнік*. Паводле словаў *Ірыны Альхоўкі* (прэзыдэнта грамадзкай арганізацыі „Беларуская асацыяцыя маладых хрысьціянскіх жанчын"),

Расея становіцца яшчэ адной краінай, дзе расейскія крымінальныя структуры гандлююць беларускімі жанчынамі. Гандаль людзьмі лічыцца трэцім па даходах злачынным заняткам пасьля збыту наркотыкаў і зброі. У Беларусі ахвярамі гандляроў становяцца жанчыны, якія мараць шляхам працы за мяжой або афармленьнем шлюбу з замежнікамі палепшыць сваё матар’яльнае становішча. Найбольш папулярныя краіны, куды імкнуцца паехаць жанчыны і дзе іх чакае небясьпека стаць рабынямі, — Польшча, Нямеччына, Галяндыя, Турцыя, Ізраіль, а цяпер і Расея.

*Кастрычнік*. Народны паэт Беларусі ***Ніл Гілевіч*** камэнтуе Другі зьезд настаўнікаў Беларусі ў артыкуле *„А пра самае набалелае — ні слова?”:* „Сярод усяго - ёсьць і самае набалелае: гэта становішча, у якім апынулася сёньня беларуская мова. Мацней набалелага болю, чым гэты, — няма. Гэтае пытаньне — у поўным сэнсе слова, пытаньне жыцьця і сьмерці. Жыцьця і сьмерці беларускай нацыі, і таму я зьвяртаюся да вас, шаноўныя дэлегаты з’езду: скжыце, хто з вас выступіў з трыбуны ў абарону беларускай мовы? Хто выказаў трывогу за яе лёс? Калегі! Сябры! Адрываючы дзяцей ад беларускай мовы, г. зн. ад беларускай духоўнай культуры, ад беларускіх нацыянальных сьвятыняў, ад беларускай гісторыі, мы будзем выхоўваць не грамадзянаў, не патрыётаў, якія забясьпечаць Беларусі эканамічны і культурны росквіт, а тых жа дзікуноў, манкуртаў і дэбілаў, якія да дабра краіну не давядуць. Давядуць беларускі народ да пагібелі, да этнічнай сьмерці. Беларускай нацыі ня стане, бо будзе зьнішчана ўсё тое, на чым любая нацыя трымаецца. Афіцыйная газэта, падводзячы вынікі работы зьезду, піша: „Принята резолюция. Теперь главное — всё, о чем говорили, осуществить... Во имя будущего Беларуси...” Панове! У імя будучыні Беларусі самае галоўнае, што трэба ажыцьцявіць, — гэта зрабіць Беларусь беларускай. А гэта значыць — зрабіць беларускую школу, — і базавую, і вышэйшую. Бяз гэтага будучыні ў Беларусі ня будзе, а будзе „Северо-Западный край”, або шэсьць заходніх губэрніяў Расеі. Няўжо вы, шаноўныя настаўнікі, гэтай элемэнтарнай ісьціны не разумееце? Не паверу. Безумоўна, разумееце! Дык чаго ж вам тады бракуе?Прынцыповасьці, мужнасьці, стойкасьці? Ну напэўна. Іначай бы сказалі гэта на зьезьдзе. І гаварылі б гэта вучням і іх бацькам кожны дзень — несьціхана-няспынна. Філістэр можа выхаваць толькі філістэра. Прыстасаванец можа выхаваць толькі прыстасаванца. Баязьлівец толькі баязьліўца. Інача кажучы, мыш пад памялом можа выхаваць толькі мыш пад памялом.”

*Кастрычнік*. Жыхары шэрагу вёсак Маларыцкага раёну выступаюць супраць будаўніцтва у іхным рэгіёне магільніка для радыёактыўных адходаў. Радыёактыўны грунт з аб’ектаў „802” і „Заходні” ў Берасьці, дзе з 1950-х па 90-я гады перагружалася ўранавая руда, улады зьбіраюцца вывозіць за межы гораду. Проста пад нос вяскоўцам.

### *ЛІСТАПАД*

*1 лістапада* ў Маскоўскім судзе Менска суддзя **Д.Антаневіч** пакараў штрафам у памеры 150 мінімальных заробкаў (каля 700 даляраў ЗША) ***Максіма Вінярскага*** і ***Аляксея Шэіна***, якія былі затрыманыя за акцыю ўшанаваньня менскіх падпольшчыкаў *(26 кастрычніка).*

*1 лістапада*. У пракуратуру Гомельскай вобласьці быў выкліканы ***Яўген Скочка*** ў сувязі зь ягонай заявай па парушэньні выбарчага заканадаўства падчас прэзыдэнцкіх выбараў. Я. Скочку не было дазволена прагаласаваць у дзень выбараў ні па месцы жыхарства ў Гомелі, ні месцы працы ў Менску, бо, як яму было патлумачана, ягонае прозьвішча „не пасьпелі ўнесьці ў выбарчыя сьпісы”.

*2 лістапада.* Тры сьвятары Менскай епархіі Беларускага экзархату Рускай Праваслаўнай Царквы — ***Пётр Бадак***, ***Вячаслаў Гнедзько*** і ***Леанід Пляц*** — былі прымусовым чынам пазбаўленыя свайго сану за „раскольніцкую дзейнасьць”. Рашэньне аб пазбаўленьні сану, прынятае Сінодам Беларускага экзархату, зацьвярджалася ў Маскве. 2-га лістапада яго падпісаў Патрыярх Маскоўскі і ўсёй Русі Алексій II.

„Раскольніцкая дзейнасьць” — гэта заклік да стварэньня нацыянальнай, Беларускай Праваслаўнай Царквы.

Ведаючы, што рускае праваслаўе прыйшло на Беларусь пасьля яе акупацыі расейскімі войскамі напрыканцы XVIII стагоддзя (пасьля падзелу Рэчы Паспалітай), Рускай Праваслаўнай Царквы ў нашай краіне нельга прымаць усур’ёз.

*2 лістапада.* Суд Маскоўскага раёну Менска вынес прысуд удзельнікам акцыі ўшанаваньня менскіх падпольшчыкаў 26 кастрычніка: ***Уладзімеру Рубінчыку*** і ***Алегу Лабатаму*** — па 3 сутак адміністрацыйнага арышту кожнаму; ***Паўлу Севярынцу*** — 10 сутак арышту; ***Алесю Нішчыку*** — штраф у 150 мінімальных заробкаў (прыкладна 700 даляраў ЗША).

***Інфармацыйная Камісія Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыіі — БНФ і прэс- служба БНФ. Па матэрыялах Камісіі, СМІ, радыё, друку („Народная Воля”, „Наша свабода”, „Пагоня”, „Ніва”, „Права на Волю” і інш.)***

# СПАДАРЫНЯ РАІСА

*(Эсэ)*

У суботу, 4-га траўня, вярнуўшыся зь беларускай дэманстрацыі, якую мы наладзілі на 1-й эвэню перад гмахам Арганізацыі Аб’еднаных Нацыяў, я патэлефанаваў спадарыні Раісе Жук-Грышкевіч у Канаду, каб выказаць свае меркаваньні пра яе ўспаміны аб стварэньні 50 гадоў таму Беларускага радыё *Вызваленьне — Свабода.*

Спадарыня Раіса да 1999 года была нязьменным сакратаром Рады БНР.

— Як шкода, — кажу я, — што той беларускі змагарны дух і тыя ідэалы Адраджэньня, на грунце якіх пачыналася беларускае радыё *Свабода*, зьніклі цяпер. Гэта ўжо ня радыё „Вызваленьне”. Заступаюць людзі свайго інтэрасу, што ня стануць бараніць Беларусь.



***Спадарыня Раіса Жук-Грышкевіч (Фота 1998 г.)***

— Ведаеце, я гэтаму ўжо не дзіўлюся, — адказвае спадарыня Раіса. — Я нічаму больш не дзіўлюся і не асуджаю, бо калі паглядзець, якое вынішчэньне, якую навалу пražыў (і пражывае зноў) наш народ, то можна толькі зьдзівіцца, што ён яшчэ жыве. Зьнішчэньне было ня толькі фізічнае, але і духовае, забіваньне Боскага, беларускага ў чалавеку.

Тут, у Канадзе, ёсьць цяперашнія людзі зь Беларусі. Яны іншыя. Яны

зусім іншыя, чым мы. Я ўжо старая. Мне ўжо стала ўсё вельмі цяжка. Сэрца. Валіцца стары адзінокі дом. Надыходзіць Вялікдзень. У Вялікую Пятніцу ў Беларускай царкве вялікая служба, сьвяты абрад — вынас Плашчаніцы. А я ня маю сілы рухацца. Не, думаю, я мушу паехаць у Таронта, каб нават сваёй прысутнасьцю і памяцьцю пра сьвятое падтрымаць Беларусь. Я паехала і была ў нашай Беларускай царкве. Мне прышлося ў Таронта пераначаваць. Я толькі вярнулася і надта змучаная, але жыве мая душа.

(„Гэтыя паводзіны і словы духоўна жывых людзей, — падумаў я. — Яны харошыя і глыбокія. Толькі як растлумачыць іншым —мёртвым духоўна, — што такое жыцьцё?!")

— Усё трымаецца на духова вялікіх людзях, — прадаўжала спадарыня Раіса. — Калі ў 1921 годзе Беларусь падзялілі і нішчылі ў паасобку, то ў Заходняй Беларусі беларусам было ўсё ж такі крышачку свабадней. Хоць практыкавалася дыскрымінацыя беларусаў, але нас, прынамсі, хоць не расстрэльвалі, не адбіралі маёмасьць. Існавалі свабодныя прафэсіі. І вось нават у такіх умовах узгадаваліся гэтакія вялікія беларусы, як ***Адам Станкевіч***, ***Вітаўт Тумаш***, ***Антон Адамовіч***, ***Вінцэнт Гадлеўскі***, ***Мікола Абрамчык***. Яны павялі. Яны давялі беларускую сьвятую ідэю іншым, маладым і прагнучым ведаў. Да гэтых людзей належыў і мой муж.

Гэтак жыла Беларусь у экзылі, і гэтак у вялікіх ідэях яна вярнулася на Радзіму. Яны, нашыя змагары, стварылі тут моцную беларускую літаратуру, паэзію, арганізавалі выданьне беларускіх кніг. Уся расейская тайная служба змагалася тут супраць нас, шмат напсавалі, але нічога ў іх не атрымалася. Вось што значыць — *„наш беларускі вольны дух"*.

Голас спадарыні Раісы гучэў так узьнёсла. Па тэмбру і манеры, ён вельмі нагадвае мне голас ***Стэфаніі Станюты*** — легенды беларускага тэатра. Спадарыня Раіса таксама — легенда. Легенда любові да Беларусі і вернасьці беларускай справе. Я думаю, што Старшыні Рады БНР ***Вінцэнту Жук-Грышкевічу*** вельмі пашанцавала, маючы такую ўзвышаную і энэргічную жонку, як спадарыня Раіса. Пэўна, каб не яна, то ці меў бы ён і палову цяперашняй сваёй вядомасьці. Бо бальшыня людзей лянівая да пісаньня.

Спадарыня Раіса гаварыла доўга, нібы сьпяшаючыся як найбольш сказаць. Голас яе, крыху ўсхваляваны, там, на другім баку, у Канадзе, неяк самотна гучэў у цішыні. І я раптам адчуў гэтую цішыню ў эфіры, і гэты стары самотны дом у горадзе Бэры, дзе я ніколі ня быў, і вячэрні змрок у пустых пакоях, і меркнучае сьвятло за сьцямнелым вакном, на фоне чужога вясеньняга неба...

— Але жыла Беларусь і будзе жыць, — пачуў я ізноў, схамянуўшыся, далёкі голас. — Нішто не зламае наш дух і наш народ. Народзяцца лепшыя, узгадуюцца моцныя.

Гэтак мы гаварылі ва ўнісон, нібы падбадзёрваючы самых сябе. Хоць і тут, у Нью-Ёрку, побач з акіянам, — чужое неба за чужым вакном, і вечаровы шэры змрок запаўзае ў цьмяныя шыбы.

*Нью-Ёрк, 4 траўня 2002 г.* **Зянон ПАЗЬНЯК**

# ЗА КАГО І ЗА ШТО ЗМАГАЛІСЯ БЕЛАРУСКІЯ ПАРТЫЗАНЫ Ў ДРУГОЙ СУСЬВЕТНАЙ ВАЙНЕ?

Мінула ўжо 55* гадоў з дня пераможнага завяршэньня Другой Сусьветнай вайны. Але існуючая сёньня на Беларусі ўлада даўно ўжо трактуе гэтую вялікую дату не як дзень Перамогі над фашызмам, у якую немалы ўклад зрабілі і беларусы, а толькі як дзень вызваленьня Беларусі Расеяй ад нямецка-фашысцкіх акупантаў. Больш таго, ён нават быў афіцыйна аб'яўлены „днём незалежнасьці" Рэспублікі Беларусь (быццам і незалежнасьцю сваёй мы абавязаны толькі Расеі). Улады начале з А.Лукашэнкам імкнуцца гэтым неяк замаскаваць і апраўдаць сваю сёньняшнюю палітыку нацыянальнай здрады, фактычна, здаючы Беларусь Расеі назад у каляніяльны стан.

Усім нам балюча памятаюцца ганебныя падзеі, зьвязаныя з днём сьвяткаваньня гэтай даты пяць гадоў таму. І тады 50-годдзе дня Перамогі адзначалася менавіта ў тым жа цынічна-ілжывым падыходзе. Падобна, што і надалей тое ж самае будзе адбывацца з большым цынізмам і зь яшчэ болей шумлівай пыхаю. Пра ўсё гэта даводзілася пісаць і раней. Думаецца, тут ня трэба зноў апавядаць, як тадышняя „брацкая" Расея амаль што бяз бою кінула Беларусь на міласьць фашысцкіх захопнікаў, выкарыстаўшы яе тэрыторыю толькі для ганебнага ўцяканьня, выдадзенае пазьней за быццам бы сьвядомы стратэгічны манэўр з „адступленьнем і контрнаступленьнем". Савецкая прапаганда была такая татальная, што мала хто ведаў, як Беларусь была змушана самастойна бараніць і вызваляць сябе шляхам шырокай партызанскай вайны. Як расейска-савецкае камандваньне не давала нам, беларускім партызанам, у дастатковай колькасьці зброі і амуніцыі, ужо тады баючыся, што 370-тысячная партызанская армія можа раптам выйсьці з-пад маскоўскага кантролю. Як не далі нам, сярэдняга рангу партызанскім камандзірам, афіцэрскага статусу, з-за чаго пазьней мы (нават стаўшы інвалідамі вайны) аказаліся без афіцэрскіх пэнсіяў. Як насычалі нашыя шэрагі стукачамі і „сексотамі", аднавіўшы нават колішні інстытут камісараў. Як пасьля цэлымі дзесяцігоддзямі чапляліся да нас кэдэбісцкія „органы", не даючы нікуды ходу за „пребывание на оккупированой территории". Як цынічна фальсіфікавалі гісторыю партызанскага руху аўтары, падобныя на галоўнага чэкіста Беларусі Цанаву, стараючыся прыпісаць нашыя ваенныя дасягненьні парткіраўніцтву і НКВД. І гэтак далей, і да таго падобнае. Доўгія асьліныя вушы традыцыйнага вялікаруска-імпэрскага шавінізму за ўсім гэтым відаць было тут надзвычай выразна.

У гісторыі беларускага партызанскага руху, аднак, і галоўнае, у ягонай сёньняшняй гістарычнай ацэнцы застаюцца яшчэ пэўныя няяснасьці. Даўно вядома, напрыклад, што менавіта дзякуючы гэтаму руху Беларусь больш чым на палову вызваліла сябе ад нямецкіх акупантаў сама. Што савецкая армія ўвайшла ўжо ў на 60 адсоткаў вызваленую Беларусь, як нож у масла, і ёй такім чынам (сумесна з польскаю АК) была расчышчана дарога на Бэрлін. Што менавіта за такое актыўнае супраціўленьне фашысцкаму агрэсару Беларусь была ўведзена (нават ня маючы фактычнага суверэнітэту) у склад дзяржаваў-заснавальнікаў Арганізацыі Аб'еднаных Нацыяў. Але сёньня пра гэта маўчаць чамусьці нават гісторыкі прагрэсіўнай палітычнай накіраванасьці. Або па-дурному паўтараюць афіцыйную характарыстыку беларускай савецкай партызанкі як чыста энкавэдзісцкай арганізацыі, ці зусім ужо (падобна сёньняшнім расейскім „усмирителям" Чачэніі) абвяшчаюць нас проста бандыцкімі фармаваньнямі.

Мы ваявалі, аднак, з фашыстамі не за разьвіты сацыялізм і не за „столицу нашей родины Москву". І тым болей не дзеля шкурнай уласнай нажывы (як пісала аднойчы вядомая ў нас рускамоўная пісьменьніца). Мы ўжо тады ваявалі, па сутнасьці, за сваю свабоду і нацыянальную незалежнасьць, хоць і не заўсёды гэта сабе правільна ўсьведамлялі. Пагэтаму і Сталін са сваімі энкавэдзісцкімі апрычнікамі пабойваўся забясьпечваць нас належным чынам зброяй, боезапасам і медыкамэнтамі. Мы ваявалі супраць ворага, што імкнуўся паставіць нас на калені, пазбавіўшы чалавечай і нацыянальнай годнасьці. І ваявалі, як вядома, ня дрэнна, хоць даводзілася часам грашыць і экстрэмізмам, і нават (не без дапамогі расейска-савецкіх інструктараў) тэрорам. Немцы баяліся нас і па-свойму паважалі.

Тое ж, што мы вымушаны былі таксама ваяваць і супраць тых сваіх суайчыньнікаў, што пайшлі на супрацоўніцтва зь немцамі (спадзеючыся менавіта гэткім спосабам дамагчыся той жа самай незалежнасьці) — гэта было толькі трагічным парадоксам гісторыі, якая пазьней апраўдала і іх. Як наіўнасьцю была наша надзея на тое, што (ваюючы ў партызанах) атрымаем мы свабоду з рук крывавага Сталіна, так і ім было наіўна спадзявацца атрымаць яе з гэтак сама ж крывавых гітлераўскіх рук. ***Васіль Быкаў*** выдатна паказаў усё тое ў сваёй знакамітай аповесьці „Знак бяды".

Гэта была сапраўды грамадзянская па форме і нацыянальна-вызвольная па зьместу трагічная вайна, калі беларусы змушаныя былі ў барацьбе за сваю незалежнасьць змагацца ня толькі зь нямецка-фашысцкімі акупантамі, але і самы з сабой.

Ваявалі мы і супраць так званай Расейскай вызваленчай арміі генэрала Ўласава, як бы смутна прадчуваючы шмат пазьнейшыя гістарычныя часы.

І вось сёньня гэтыя часы насталі, і гісторыя беларускага партызанскага руху бачыцца нам яшчэ ў адным вельмі важным ужо і палітычным аспэкце. У трагічных абставінах магчымай згубы ўласнай незалежнасьці і дзяржаўнага суверэнітэту шмат якія беларусы і небеларусы пачынаюць паціху згінаць свае калені перад актыўным націскам Расейскай Фэдэрацыі, якая ў сваіх імпэрскіх прэтэнзіях ужо заліла крывёю гордую і незалежную па духу Чачэнію і пачала ўжо прагна пазіраць на пакуль што незалежную і суверэнную Рэспубліку Беларусь. У расейскіх кіруючых колах зусім не хаваюць, напрыклад, цынічнага намеру ператварыць яе ў правінцыяльную губернію „единой и неделимой" Расейскай імпэрыі, каб зноў скарыстоўваць беларускія землі ў якасьці стратэгічнага палігона і шчыта ў магчымай новай сусьветнай вайне, не пытаючыся дазволу ў беларускага народа. І ў гэтых умовах вельмі карысна было б нагадаць і беларусам, і гэтым прагным усходнім „господам" наша ня так ужо й далёкае партызанскае мінулае. Мінулае, калі мы іржавымі вінтоўкамі ды зьнятымі з кінутых расейцамі танкаў кулямётамі пасьпяхова процістаялі магутнейшай у Эўропе нямецкай арміі, якая ні ў якое параўнаньне не стасавалася з сучасным расейскім войскам, што спрабуе і ня можа канчаткова „замочить"нашых калегаў па няшчасьці чачэнскіх партызанаў, якое здзяйсьняе мэтадамі дзяржаўнага тэрору не „антытэрарэстычную" апэрацыю, а самы сапраўдны генацыд.

Супастаўленьне тых дзён з сёньняшнімі падзеямі ў Чачэніі тут узьнікае ня толькі ў форме выпадковай аналёгіі. Падабенства мае глыбінныя карані. Калі ўспомніць чачэнскую вайну часоў талстоўскага Хаджы-Мурата (якога, дарэчы, вядомы рускі пісьменьнік апісваў з глыбокай сімпатыяй і спачуваньнем), гэтае падабенства набывае і злавесную канкрэтна-гістарычную рэальнасьць.

Прыблізна ў тыя ж самыя часы расейская імпэрыя рукамі тых жа генэралаў адстойвала зброяй сваю „целостность и неделимость" у Польшчы і на Беларусі, бязьлітасна топячы ў крыві і тутэйшы нацыянальна-вызвольны рух. Пагэтаму і сёньня, калі Расея справакавала ў Чачэніі партызанскае супраціўленьне, сур'ёзнасьць якога прызнаюць нават некаторыя расейскія генэралы, становіцца зразумелым кожнаму, чаму яна з такою прагнасьцю пачынае прыглядацца цяпер і да незалежнай Беларусі. У Чачэніі Расеі патрэбна нафта, на Беларусі — тэрыторыя для разьмяшчэньня ракетна-ядзерных установак. Расея адкрыта гаворыць пра „наступательный" характар яе сёньняшняй зьнешняй палітыкі, ня грэбуючы ў той жа час (зусім, як у Пушкіна) і „подкупательным" падыходам, напрыклад, да так званай беларускай „апазыцыі".

Ня так даўно ў Расеі прынята новая ваенная дактрына, якая дазваляе ёй першай ужываць ядзерную зброю!

Няцяжка ўявіць сабе, чым усё гэта можа скончыцца (не зважаючы на ўсю цяперашнюю расейскую дыпляматыю). Ня будзем казаць пра выпадковую магчымасьць разьвязаньня Сусьветнай ядзернай вайны з усімі яе злавеснымі наступствамі па чыстаму непаразуменьню, хоць і гэта даволі верагодны варыянт (калі ўлічваць інтэлектуальны і маральны ўзровень расейскіх палітыкаў і генэралаў). Пры сёньняшняй апатыі беларускага насельніцтва і пры здрадніцка-халопскай (скажам проста) пазыцыі яе рускамоўнай інтэлігенцыі, цалкам можа стаць рэальнасьцю акупацыя Беларусі расейскімі войскамі і закончыцца такім жа (як некалі ў Аўстрыі) цынічным аншлюсам.

Але ня ўсе ўжо беларусы пагодзяцца з гэткаю доляй, асабліва беларуская моладзь. Адведаўшы свабоды і незалежнасьці, яна таксама пачне, ўрэшце рэшт, арганізоўваць актыўнае супраціўленьне. Будучы ўсё яшчэ ў меншасьці, яна можа аказацца змушанай зьвярнуцца і да мэтадаў адчайнай партызанскай барацьбы, успомніўшы вопыт сваіх партызанскіх дзядоў, не выключаючы, магчыма, і радыкальных прыёмаў вайны. І ня толькі па даўняму беларускаму ці цяперашняму чачэнскаму ўзору, але і па прыкладу самой жа Расеі, якая менавіта і зьяўляецца радзімай ня толькі індывідуальнага, але і дзяржаўнага тэрарызму ня толькі сёньня, але і ў недалёкай мінуласьці (успомнім бальшавіцкія пастановы аб увядзеньні „красного террора" і арганізацыю дзеля гэтай мэты вядомай ЧК зь яе Курапатамі і архіпелагамі ГУЛАГ!).

І Беларусь цалкам тады можа ператварыцца ў новую Чачэнію з куды больш небясьпечнымі і далёкаідучымі наступствамі, калі ўлічыць тое, што яна не на мяжы з Азіяй, а ў сярэдзіне Эўропы. І крыві можа быць тут праліта куды больш, чым у няшчаснай Чачэніі.

Але віна за ўсё гэта ляжа на галоўнага правакатара — на Расею.

У гэтых абставінах наогул пазыцыя сёньняшніх беларускіх уладаў (і асабліва самога А.Лукашэнкі) выглядае і злачыннай, і (як гавораць медыкі) проста неадэкватнай. У маральна-юрыдычным аспэкце справы такая пазыцыя набывае крымінальны характар ня толькі як прадугледжаная артыкулам 61-м Крымінальнага Кодэксу (здрада дзяржаве з абцяжарваючымі абставінамі), але і як пазыцыя падпальшчыка вайны, прадугледжаная міжнароднымі пагадненьнямі.

Але яна незразумелая нават з банальна жыцьцёвага пункту погляду. Нават калі б А.Лукашэнка прытрымліваўся толькі шкурна-эгаістычных мэтаў, яму было б куды разумней і выгадней застацца прэзыдэнтам незалежнай Рэспублікі Беларусь, чым узяць на сябе ролю правінцыяльнага расейскага губэрнатара, накшталт Кандрацэнкі ці Руцкога, і стаць для Крамля „мальчиком на побегушках". Тым болей, што пэрспэктыва стаць прэзыдэнтам Расеі сёньня яму ўжо ніяк ня сьвеціць. Сталі ж такімі самастойнымі прэзыдэнтамі, ня кажучы ўжо аб Кучме, і Назарбаеў, і Шэварнадзэ, і Аліеў, і некаторыя іншыя кіраўнікі сярэднеазіяцкіх краінаў. Так ці гэтак, але іх падтрымліваюць сёньня ўласныя народы, нават лёгкадумна даруючы ім іх вельмі непрыгожае кадэбісцкае мінулае.

Лукашэнка ж са сваёй наіўна-камічнай прэтэнзіяй стаць гаспадаром „всея Русі" страціў пэрспэктыву, заблытаўся ў сваёй, фактычна, здрадніцкай зьнешняй палітыцы і ператварыўся сёньня ў звычайную марыянэтку, якая ўжо ня можа ня слухацца сваіх усходніх гаспадароў. Так што і традыцыйных трыццаці срэбнікаў шклоўскі прэтэндэнт на Крэмль не атрымае. Нават зваліць на Расею адказнасьць за той эканамічны тупік, у які ён завёў Беларусь, ня ўдасца, бо і рускія яго „саюзьнікі" ўвесь час адхрышчваюцца ад ягонай тупікова-застойнай эканомікі.

Адзін зусім не дурны філёсаф сказаў неяк, што ўсё ў гісторыі паўтараецца двойчы: спачатку ў выглядзе трагедыі, а ў канцы выступае ўжо як звычайная камэдыя. Менавіта сёньня мы яе і назіраем. Але тут гэта вельмі небясьпечная камэдыя. Яна пагражае ператварыцца для беларускага народу ў новую, і яшчэ можа болей цяжкую, трагедыю, за якую некалі Лукашэнку і ягоным калябарантам ўсё ж такі прыдзецца адплаціць. І адплаціць па высокаму кошту. Бо (як некалі казаў другі філёсаф) у гісторыі ўсьлед за выклікам заўсёды наступае адпаведны па сваёй значнасьці адказ.

Вось якія думкі прыходзяць мне ў галаву ў гадавіну перамогі над нямецкім фашызмам і вось што трывожыць сёньня сэрцы былых беларускіх партызанаў.

*2000 г., г. Менск*

***Мікола КРУКОЎСКІ***
***доктар філясофскіх навук, прафэсар,***
***былы начштаба атрада 2-й Заслонаўскай***
***партызанскай брыгады***

* * *

## *ПАСЬЛЯСЛОЎЕ*

*Доктар М. Крукоўскі закрануў самае балючае для беларусаў пытаньне 2-й Сусьветнай вайны: змаганьне супраць акупантаў па абодвух баках канфлікту ў становішчы ворагаў.*

*Гэтакае мінулае патрабуе глыбокага, і менавіта* ***беларускага асэнсаваньня****. Гісторыя захавала факты, якія сьведчаць, што як расейцы, гэтак і немцы, баяліся самастойнасьці беларускіх вайсковых фармаваньняў. Немцы дазволілі на іх толькі ў 1944 годзе (калі ўжо было позна). А расейцы ў 1943 годзе правялі ў Беларусі спэцапэрацыю па адхіленьні ад камандваньня і вынішчэньні партызанскіх камандзіраў-беларусаў і проста актыўных партызанаў беларускай нацыянальнасьці. Іхныя месцы займалі расейцы (як правіла, энкавэдзісты). Сталін і Гітлер дзейнічалі аднолькава. (рэд.)*

* Артыкул напісаны ў 2000 годзе (*рэд.*)

# ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

*3 красавіка* суд Цэнтральнага раёна Менска вынес прысуд удзельніку сьвяткаваньня сёлетняга Дня Незалежнасьці сп. ***Андрэю Ачапоўскаму***, сябру *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ*, штраф у памеры 1,5 мільёнаў рублёў *(каля 900 даляраў ЗША)*. Лукашэнкаўская „відушчая" Фэміда жорстка пакарала дзясяткі беларускіх патрыётаў за сьвяткаваньне нацыянальнага сьвята.

*6 красавіка* сябры *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ* прышлі ў *Курапаты* на традыцыйную штосуботнюю талаку. Больш за 30 асобаў добраўпарадкавалі тэрыторыю, прыбіралі магілы. Сьвятар асьвяціў таксама ўсталяваныя тыдзень таму крыжы.

*9 красавіка* ў газэце *„Наша Свабода"* быў надрукаваны матэр'ял „Крыжовая дарога ў Курапатах" аўтарства Марата Гаравога. Там паведамляецца пра штосуботнюю талаку ў Курапатах і, ў прыватнасьці, пра апошнюю талаку *(6-га красавіка*). Аўтар абапіраецца на словы сп. С.Сахарава (прадстаўніка грамадзкай ініцыятывы „За ўратаваньне мэмарыялу Курапаты"). Згадваюцца таксама супольнасьць „Мартыралёг" і ГА ТБМ як „ініцыятары работ па доглядзе за пахаваньнямі і па добраўпарадкаваньні".

Мусім адзначыць, што гэты матэр'ял нясе дэзінфармацыю і не адлюстроўвае сапраўднага стану рэчаў. Згаданыя асобы і арганізацыі ня маюць ніякага дачыненьня да *Крыжовай дарогі ў Курапатах* (паказанай на здымку ў газэце); іхных прадстаўнікоў не было і на талацэ 6-га красавіка. Ідэя і выкананьне *Крыжовай дарогі ў Курапатах* належыць сябрам *Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне"* (пад кіраўніцтвам *Зянона Пазьняка*) і *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ*. 6-га красавіка менавіта сябры *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ* працавалі на талацэ ў Курапатах, пра што ў сродкі масавай інфармацыі было пададзена паведамленьне.

*19* і *20 красавіка* сябры *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ* правялі *ў Курапатах* традыцыйную талаку. Працавала каля трыццаці чалавек. Добраўпарадкавалі тэрыторыю, прыбіралі магілы. Было пастаўлена 40 крыжоў, якія сталіся гарманічнай часткай ***Народнага Мэмарыялу „Лес Крыжоў"*** памяці ахвяраў камуна-расейскага тэрору супраць беларускага народу.

*20 красавіка ў Менску* адбылося чарговае паседжаньне *Сойму Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне"* і *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ*. Прынятая Заява ў абарону беларускай мовы.

*24 красавіка* сябры *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ* працавалі *ў Курапатах,* прыбіраючы тэрыторыю *Народнага Мэмарыялу.* Пахавалі парэшткі невядомай ахвяры, усталявалі на магіле крыж. Сьвятар ***Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы*** айцец ***Леанід Акаловіч*** адслужыў над магілай багаслужбу.

*26 красавіка* сябры *Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне"* і ягонай *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ* адзначылі сумную гадавіну Чарнобыльскай трагедыі. Каля 200 чалавек сабраліся ў цэнтры Менску, каля плошчы Незалежнасьці а $17^{30}$. Потым яны прайшлі калёнай па праспэкце Францішка Скарыны. Традыцыйнае шэсьце *Чарнобыльскі Шлях* адбывалася пад лёзунгамі, напісанымі на транспарантах: *„Жыве Беларусь!" і „Чарнобыльская катастрофа — вынік каляніяльнай палітыкі Крамля"*. Людзі несьлі нацыянальныя *Бел-Чырвона-Белыя сьцягі* і стужкі, гукалі „Жыве Беларусь!". Шэсьце дайшло да плошчы Цэнтральнай.

*26 красавіка ў Гомелі* адбыўся мітынг, прысьвечаны 16-й гадавіне катастрофы на Чарнобыльскай АЭС. Каля 200 гараджан узялі ўдзел у мерапрыемстве, якое пачалося з ушанаваньня хвілінай маўчаньня памяці ахвяраў атамнай катастрофы. У сваіх эмацыйных выступах прадстаўнікі гомельскіх партыяў і грамадзкіх арганізацыяў з болем гаварылі пра сацыяльна-эканамічныя праблемы асуджаных на выміраньне і жабрацтва палешукоў, злачынную бяздзейнасьць уладаў і абыякавасьць насельніцтва да ўласнага лёсу.

Мітынг праходзіў пад *Бел-Чырвона-Белымі нацыянальнымі сьцягамі* і плякатамі: ***„НЕ — расейскай акупацыі!", „Спыніць каланізацыю Палесься!", „Даеш новыя выбары пад міжнародным пратэктаратам!"*** і іншымі. Напрыканцы мерапрыемства намесьнік старшыні *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ* ***Уладзімер Старчанка*** зачытаў рэзалюцыю, якая аднадушна, пад воклічы *„Жыве Беларусь!, Жыве вечна!"*, была ўхвалена ўдзельнікамі мітынгу.

<u>Вытрымкі з рэзалюцыі гамяльчанаў.</u>

*16 гадоў прайшло з таго часу, як прырода нашага квітнеючага Палесься ператварылася ў варожы чалавеку асяродак. Дэмаграфічныя, мэдычныя, матэрыяльныя і маральныя страты насельніцтва не паддаюцца ўліку.*

*Замест дапамогі беларусам улады арганізавалі каланізацыю нашай зямлі бежанцамі, бамжамі і беглымі крымінальнікамі з Расеі і Азіі. Для гэтага сродкі ва ўлады знаходзяцца. А вось на тое, каб змагацца з наркаманіяй, СНІДам, злачыннасьцю, якія чужынцы прынесьлі на наша Палесьсе, сродкаў няма. Цынізм і нахабства ўладаў павялічваюцца з хуткасьцю, прапарцыйнай росту ракавых захворваньняў і колькасьцю памерлых ад лейкозаў дзетак. Гэткі зьдзек працягваецца ўжо другое дзесяцігоддзе.*

*Ужо па другому і трэцяму разу людзі, вінаватыя ў замоўчваньні рэальных наступстваў катастрофы і злачынным бязьдзеяньні, дарваліся да вышэйшай улады, селі ў сенатарскія, міністэрскія і „вертыкальныя" крэслы.*

*Мы, гамяльчане, даўно пераканаліся, што людзі без сумленьня ня могуць, ня хочуць і ня будуць працаваць на Беларусь, ня будуць вырашаць праблемы нашага пацярпелага ад Чарнобылю і іхнае палітыкі рэгіёна. Яны будуць вырашаць толькі свае ўласныя праблемы за наш кошт. Яны і далей будуць гандляваць нацыянальнымі і эканамічнымі інтарэсамі Беларусі, дзяржаўным суверэнітэтам, таптаць законы і Канстытуцыю краіны, зьдзекавацца з нацыянальных пачуцьцяў беларусаў і рэлігійных традыцыяў вернікаў.*

*Палітыка, якую яны праводзяць, завецца каляніяльнай, а самы яны прадстаўляюць тут каляніяльную адміністрацыю Расеі. Вынікі такой палітыкі мы бачым кожны дзень.*

*Аднак, памятаючы пра сваю чалавечую годнасьць, мы патрабуем:*

*— спыніць антынародную палітыку рэжыму Лукашэнкі і аднавіць на Беларусі канстытуцыйную законнасьць, справядлівасьць і парадак;*

*— спыніць каланізацыю Палесься шляхам прываблiваньня на нашу зямлю бежанцаў, беглых крымінальнікаў і асобаў без грамадзянства.*

*Разумеючы, што справіцца з эканамічнымі, сацыяльнымі і культурнымі бедамі нашага народа нельга без вырашэньня праблемаў палітычных, мы патрабуем адхіленьня ад улады Лукашэнкі і ягонай каляніяльнай адміністрацыі праз правядзеньне новых прэзыдэнцкіх выбараў пад міжнародным пратэктаратам.*

*2 траўня.* Штодня ў Курапаты прыходзяць людзі. Яны моляцца каля крыжоў над магіламі беларускіх пакутнікаў, ставяць сьвечкі, добраўпарадкуюць тэрыторыю, рэгулярна хаваюць па-хрысьціянску чарапы і косткі ахвяраў расейска-бальшавіцкага тэрору, знойдзеныя на тэрыторыі ўрочышча. Працягваецца крыжаўзьняцьце: людзі ставяць над

магілямі крыжы *Народнага Мэмарыялу*. Сябры *Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне”* і ягонай *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ* асабліва актыўна працуюць у Курапатах, проста, па-чалавечы выконваючы свой хрысьціянскі абавязак.

Трэба, аднак, сказаць урэшце пра асобаў, якіх ніхто ня бачыў на малітве або на працы ў Курапатах, якія не абаранялі ад ОМОНу і бульдозэраў курапацкія магілы. У лепшым выпадку яны аднойчы прайшліся па ўрочышчу, раздаючы інтэрв’ю. Называючыся „экспэртамі” і „мастацтвазнаўцамі”, яны ўтварылі „камітэты” і камітэцікі, адзінай мэтай якіх ёсьць супраціў стварэньню *Народнага Мэмарыялу*, што ўжо існуе ў Курапатах. Спачатку яны ў хаўрусе з кэгэбісцкім Фондам міру хацелі паставіць у Курапатах „знак шчасьця і прымірэньня” у выглядзе падковы, потым пабудаваць на магілах жалезабэтонны мэмарыял. Калі праваліліся гэтыя шалёныя ідэі, яны далучылі да сваёй разбуральнай справы нейкія нікому не вядомыя групоўкі, накшталт „прагрэсіўнага юдаізму” і г.д. Калі хрысьціянская праца людзей у Курапатах прывяла да правалу і гэтай чарговай правакацыі, „камітэтчыкі” пачалі заяўляць, што „пара спыніць некантралюемае, стыхійнае стаўленьне крыжоўу Курапатах, не дапусьціць манаполіі” і г.д.

У нашай краіне, якая мае спрадвечную хрысьціянскую традыцыю, на беларускай зямлі, дзе мы жывём і існуем, знайшліся асобы і групоўкі, якія імкнуцца не дапусьціць народнага рушэньня па стварэньні хрысьціянскай сьвятыні на месцы пакутніцтва. Гэтыя асобы (як бы яны ні называліся) дзейнічаюць у хаўрусе і па загаду сатанінскіх уладаў. І справа іхная марная. Сьведамыя людзі Беларусі ідуць у Курапаты з крыжамі, ствараюць там сапраўдны *Народны Мэмарыял. Вядзе іх тудой* ***Памяць*** *пра нашыя ахвяры і высакародная хрысьціянская ідэя, якая гуртуе наш народ.*

Беларусы абароняць сваю сьвятыню ад варвараў.

*4 траўня. У Нью-Ёрку* адбылася дэманстрацыя беларусаў перад будынкам ААН супраць этнацыду на Беларусі і вынішчэньня Беларускай мовы. Дэманстрацыя прайшла пад патрыятычнымі лёзунгамі і *Бел-Чырвона-Белымі сьцягамі.* Скандавалі патрабаваньні, сьпявалі гімны, раздавалі лістоўкі на ангельскай мове прахожым. Дэманстрацыю арганізавалі сябры нью-ёркскага *Аддзелу БАЗА* і прыхільнікі *Народнага Фронту.*

*14 траўня* сябры *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ* прыйшлі на Вайсковыя могілкі ў Менску, каб памянуць нашых продкаў у дзень *Радаўніцы.* Людзі ўсклалі кветкі на магілы ***Янкі Купалы*** і ***Якуба Коласа, Усевалада Ігнатоўскага****, маці Янкі Купалы,* сьпявалі беларускія гімны.

А 13-й гадзіне сябры *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ* сабраліся ў Курапатах. Выступілі прадстаўнікі Партыі, а таксама вядомы рэжысёр ***Валеры Мазынскі***, які казаў пра ***Ўладзіслава Галубка***, знакамітага беларускага дзеяча тэатральнага мастацтва, забітага ў Курапатах расейска-бальшавіцкімі катамі. Каталіцкі сьвятар а. Пётра і сьвятар Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы а. Леанід адслужылі імшу за душы ахвяраў расейска-бальшавіцкага тэрору, пахаваных у Курапатах. Потым сьвятары асьвяцілі дзясяткі крыжоў, усталяваных сябрамі Партыі і Фронту на магілах ахвяраў.

*16 траўня* а $18^{30}$ сябры *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ* сабраліся каля помніка ***Янку Купалу*** ў Менску. Так распачалася новая культурніцкая акцыя, прысьвечаная 120-м угодкам нараджэньня вялікіх песьняроў Беларусі — ***Купалы*** і ***Коласа***. З уступным словам выступіў старэйшы сярод прысутных, 72-гадовы спадар ***Генадзь Банкевіч***. Ён успомніў далёкія 30-я гады, калі вучыўся ў школе ў Заходняй Беларусі, дзе было забаронена размаўляць па-беларуску. Успомніў, як вучні ўпотай чыталі і паўтаралі патрыятычныя вершы *Купалы*, таксама забароненыя акупацыйнай уладай.

*23-25 траўня.* Сябры і прыхільнікі *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ* правялі шэраг мерапрыемстваў у Менску.

*23 траўня* а $17^{30}$ людзі сабраліся на традыцыйныя паэтычныя чытаньні каля помніка Янку Купалу. Літаратуразнаўца ***Валянціна Мароз*** гаварыла пра жыцьцядайнасьць паэзіі вялікага песьняра; дэклямавалі вершы, сьпявалі песьні на творы *Купалы*.



***Курапаты-2002. Крыжовая дарога***

*25 траўня* аб $11^{00}$ сябры Фронту прыйшлі да помніка ***Максіму Багдановічу***, каб ушанаваць памяць паэта ў гадавіну ягонага скону. Да помніка былі ўскладзеныя кветкі, чыталі вершы, сьпявалі *„Зорку Вэнэру”* ды іншыя песьні на вершы паэта. А $12^{00}$ сябры *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ* сабраліся ў Курапатах на традыцыйную штосуботнюю талаку. Высякалі хмызьняк, добраўпарадкавалі могілкі, рыхтавалі месцы для ўсталяваньня крыжоў *Народнага Мэмарыялу*.

***Прэс-служба Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ. Валеры БУЙВАЛ***

# ПРЭС-РЭЛІЗ

*(Паводле „Народнай Волі”, „Нашай Свабоды”, радыё „Свабода” і інш. Кастрычнік - лістапад 2001 г.)*

■ ***Аляксандар Старыкевіч*** піша пра лукашэнкаўскую „апазыцыю” *(„Беларускія лекцыі”, — „Народная Воля”, 19.10.2001)*: „Многія „апазыцыйныя” дзеячы папросту пераарыентаваліся на добраўпарадкаваньне асабістага побыту. Справа ў тым, што пакуль у краіне дзейнічае таталітарны рэжым, можна разьлічваць на падтрымку звонку, у тым ліку і фінансавую. Як правіла, гэта драбяза, далёкая ад дэкляраваных лукашэнкаўскай прапагандай сотняў мільёнаў даляраў. Але на жыцьцё некалькім асобна ўзятым прафэсійным апазыцыянерам цалкам хапае. Часам складваецца ўражаньне, што іхныя пляны дзейнасьці распрацоўваюцца і зацьвярджаюцца ў „прэзыдэнцкай” адміністрацыі. У

выніку беларускія дэмакраты з апазыцыянераў, якія валодаюць нейкім уплывам, пераўтварыліся ў дысідэнтаў, здольных фіксаваць факты парушэньняў правоў чалавека і распаўсюджваць інфармацыю пра гэта. Аптымальны варыянт для ўлады, які выключае сур’ёзную пагрозу яе зьмены і ў той жа час стварае бачнасьць дэмакратыі”.

■ *У г. Сьвіслач на Горадзеншчыне* невядомыя асобы пашкодзілі помнік ***Кастусю Каліноўскаму***. Бюст Сталіна пастаўлены нядаўна, паводле рашэньня ўладаў, непадалёк ад помніка беларускаму герою.

■ Расейцы паведамілі, што не выключаюць аб’яднаньня авіякампаніяў „Белавія” і „Аэрафлёт”. Ужо створаны інвэстыцыйны камітэт, які разглядае магчымасьць фінансаваньня супольных праектаў. Адзін зь іх — аэрапраект. Адным словам, сьветлыя пэрспэктывы...

■ Паводле дасьледваньняў спэцыялістаў, 50-ці адсоткам дарослага і дзіцячага насельніцтва Беларусі не хапае вітамінаў **A** і **C**, а 30% — вітаміна **B**. Адсюль у беларусаў і дрэннае здароўе.

■ У сярэдзіне кастрычніка Лукашэнка падпісаў яшчэ адзін гістарычны дэкрэт „Аб павышэньні ролі навукі і рэфармаваньні Акадэміі Навук Беларусі”. Гэтым дакумантам нядаўні саўгасны старшыня даў сабе права прызначаць і адпраўляць у адстаўку прэзыдэнта Акадэміі, а таксама зацьвярджаць яе Прэзыдыюм. Прычым, калі Прэзыдыюм ён абавязаўся зацьвярджаць „зь ліку навукоўцаў”, то наконт прэзыдэнта такой агаворкі зроблена не было. І падабраў акадэмікам новага начальніка: „доктара эканамічных навук” са сваёй адміністрацыі, усім вядомага **Міхаіла Мясьніковіча**.

Дарэчы, доктарская дысертацыя Мясьніковіча была абароненая ў 1998 г., калі ён ужо займаў пасаду кіраўніка адміністрацыі Лукашэнкі. (Пост-савецкаму чытачу нічога тлумачыць ня трэба.)


The human rights are not the main priority for the Belarusan people but the independence and freedom. Because “the human rights” cannot exist under the occupation.

■ Нацыянальная тэлерадыёкампанія Беларусі таксама атрымала новага шэфа. **Ягор Рыбакоў**, ураджэнец Навасібірска (горад у Расеі), але скончыў завочна Магілёўскі пэдагагічны інстытут. Яшчэ адзін „русскій з Магілёву”. 30-гадовы дэпутат „палаткі” адразу атрымаў на БТ мянушку „хлопчык з Магілёву”.

■ *„Народная Воля”* надрукавала адкрыты ліст Анатоля Сідарэвіча, дзеяча БСДП(НГ). Ён піша, што „М.Статкевіч — правакатар у дэмакратычным руху (пра гэта сьведчыць і апошняя ягоная з Аляксандрам Фядутам супольная акцыя), што ён і ягоныя людзі ў БСДГ(НГ) сьвядома падстаўлялі людзей па-за партыяй пад удары АМАПу, ГБ і пракуратуры, што ён, стварыўшы сабе імідж „мужнага змагара”, злоўжываў і злоўжывае даверам большасьці БСДП(НГ) для забесьпячэньня сваёй сям’і, дабрабыту сваіх людзей у партыі, самавольна, бескантрольна выдаткоўвае сродкі, якія ахвяруюцца (зь Нямеччыны, — В.Б.) на патрэбы партыі”. Урэшце тое, пра што ведалі або здагадваліся амаль усе, было выказана публічна.

■ У гістарычнай частцы *Крычава*, якраз там, дзе пачынаўся ў 12-м стагоддзі старажытны *Крэчут* (так называўся летапісны горад), зьнішчана самае старое ва ўсходняй Магілёўшчыне дрэва. Невядомыя вандалы аблілі дуб-волат бэнзінам і падпалілі апошняе, што зьвязвала Крычаў зь мінулым.

■ *У Мсьціславе* невядомыя вандалы пашкодзілі помнік першадрукару ***Пятру Мсьціслаўцу***, які быў устаноўлены 2 верасьня 2001 г. падчас сьвяткаваньня Дня беларускай пісьменнасьці.

■ На сёньняшні дзень калгасы і саўгасы Мсьціслаўшчыны маюць фантастычна вялікую запазычанасьць за ўжо скарыстаную імі электраэнэргію, настолькі грандыёзную па сваіх памерах, што адразу ў яе нават цяжка паверыць. Калгасныя спажыўцы раёну павінны канцэрну „Белэнэрга” суму, эквівалентную 2-м мільёнам даляраў.

■ Далёка ня ўсе шматдзетныя маці Беларусі лічацца маці-гераінямі. Так *у Чэрыкаўскім раёне на Магілёўшчыне* такі статус маюць і карыстаюцца адпаведнымі ільготамі толькі 31% усіх маці, што маюць 5 і больш дзяцей. Астатнія злоўжываюць алькаголем, абыякавыя да дзяцей, праяўляюць да іх жорсткасьць. Толькі сёлета 9 чэрыкаўскіх жанчын пазбаўленыя мацярынскіх правоў.

■ Лукашэнкаўскія дажынкі-2002 будуць ладзіць у Полацку. Мясцовыя ўлады зьбіраюцца пабудаваць вялікі амфітэатр, прычым не дзе-небудзь, а на самім *Верхнім Замку*, ля сьценаў *Сафійскага сабору*. Месца гэтае памятае ***Рагвалода*** і ***Усяслава***, тут нарадзілася беларуская дзяржаўнасьць. *Верхні Замак абвешчаны ахоўнай тэрыторыяй Полацкага дзяржаўнага гістарычнага запаведніка і там забароненае ўсялякае будаўніцтва*. Герастратаўскую шалёную ідэю будаўніцтва забаўляльнага амфітэатру ў гістарычнай зоне ўхваліў кіраўнік гарадзкой „вэртыкалі” **Тачыла**.

■ Найвышэйшую ўзнагароду Беларускай дзяржавы — *ордэн Францыска Скарыны* — уручыў Лукашэнка іншаземцу Паўлу Барадзіну. Так адзначаная „мужнасьць крамлёўскага заўхоза, праяўленая ў нью-ёрскай вязьніцы”. Мяркуем, на чарзе ўзнагароджаньне Кадафі, Хусэйна ды іншых знаёмцаў Лукашэнкі.

■ Удзельнікі міжнароднай канфэрэнцыі „Сусьветная супольнасьць супраць глябалізацыі, злачыннасьці і тэрарызму” атрымалі інфармацыю, што ў 90-я гады найбольшы рост злачыннасьці назіраецца ў Расеі і краінах СНД. Калі ў 1989 г. у РФ дзейнічала 485 крымінальных груповак, то ў 1995 г. ужо 8.222.

■ Ад розных захворваньняў сардэчна-сасудзістай сістэмы ў Беларусі пакутуюць 1,5 мільёна чалавек. У 40% выпадкаў менавіта гэтыя захворваньні прыводзяць людзей да інваліднасьці. Штогод ахвярамі сардэчных хваробаў становяцца ў сярэднім 70 тысячаў чалавек. Гэтыя лічбы назваў дырэктар Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтру „Кардыялёгія” прафэсар *Мікалай Манак*, выступаючы на канфэрэнцыі ў Гомлі.

■ У крызіснай сітуацыі знаходзіцца Аршанскі льнокамбінат — буйное прадпрыемства лёгкай прамысловасьці. Асноўнай праблемай зьяўляецца недахоп сыравіны, выкліканы фінансавымі цяжкасьцямі, што прывяло да зьніжэньня аб’ёму вытворчасьці. Сёньня не працуюць дзьве фабрыкі з трох, што ўваходзяць у склад камбінату. Рабочых адправілі ў вымушаны адпачынак з захаваньнем 60% заробку. Гэта працягваецца ўжо некалькі месяцаў.

***Валеры БУЙВАЛ***


Беларускія Ведамасьці

Беларускае выданьне

У супрацоўніцтве зь Беларускім Выдавецкім Таварыствам ў Амэрыцы

**Рэдакцыя: Зянон Пазьняк, Галіна Палачаніна**

**Адрас рэдакцыі: 02-017 Warszawa, Al. Jerozolimskie 125/127**

**тэл./факс: (+48 22) 628 76 73**